Пралетарыі ўсіх краёў, зьлучайцеся!

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Іншыя адрасы: іншагародняя	— 20 к.
часовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі насярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльныя на 50 проц. дарожэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 112 (2300) Чацьвер, 17-га мая 1928 г.

Польшча і Літва.

Водлуг паведамленьняў з Коўні, польска-літоўскія перамовы паступова ўсё больш і больш паглыбляюцца і пачынаюць закранаць самыя вострыя пытаньні. 12-га мая літоўскі друк паведамляў, што, водлуг вестак з пэўных крыніц, літоўская дэлегацыя адхіліла польскі праэкт дагавору аб ненападзе, прызнаўшы яго нямэтазгодным для Літвы. Дадатковыя паведамленьні зазначалі, што асноўнай прычынай адхіленьня зьявілася нежаданьне польскага боку ўключыць у дагавор актуальнае для Літвы пытаньне аб Віленшчыне. У той-жа дзень літоўскія студэнты паўторна спрабавалі наладзіць варожую дэманстрацыю перад готэлем, у якім памясьцілася дэлегацыя Польшчы.

Характэрна, што ня гледзячы на гэткія паведамленьні з літоўскіх крыніц, польскія афіцыйныя паведамленьні абмяжоўваюцца сухім выкладаньнем ходу перамоў. У афіцыйным паведамленьні аб пасяджэньні, якое адбылося ў Коўні таго-ж 12-га мая, польскае тэлеграфнае агенцтва толькі адзначыла, што літоўская дэлегацыя перадала польскай дэлегацыі адказ на польскі праэкт дагавору аб ненападзе і канвэнцыі аб арбітражы і заміраючай працэдуры. Агенцтва дадало, што наступнае пасяджэньне камісіі па агульнай згодзе абодвых бакоў павінна адбыцца 25-га чэрвеня ў Коўні.

У зьвязку з гэтым цікава прасачыць за тымі абставінамі, якія папярэдня адбыліся перад гэтым паваротам у ковенскіх перамовах. Некалькі дзён таму назад у спэцыяльнай гутарцы з карэспандэнтамі чужаземных газэт кіраўнік польскае дэлегацыі, польска-літоўскае камісіі па пытаньнях бязапасьнасьці і пагоджаньні прэтэнзій (пад апошнімі разумеюцца прэтэнзіі Літвы аб выдачы ўзнагароды за матар'яльную шкоду ў сьвязку з захопам польскім генэралам Жэлігоўскім Вільні ў 1920 г., а таксама контрпрэтэнзіі Польшчы, адносна стратаў, учыненых апошняй парушэньнем Літвой нэйтралітэту ў 1920 годзе) і кіраўнік усходняга дэпартаменту польскага міністэрства замежных справ Галуўка зрабіў наступную сэнсацыйную заяву: **«Польшча зацікаўлена ў тым, каб існавала незалежная Літва, бо апошняя знаходзіцца між дзьвюма буйнымі дзяржавамі: Нямеччынаю і СССР. Польшча, для якое могуць наступіць цяжкія хвіліны, зацікаўлена ў тым, каб у агульным фронце з ёю былі ўсе прыбалтыцкія дзяржавы, у тым ліку і Літва».** Апрача таго ў гутарцы з ковенскім карэспандэнтам нямецкае газэты «Бэрлінэр Тагэблят» Галуўка да ўсяго гэтага дадаў, што факт разьдзелу Польшчы між Нямеччынаю і Савецкай Расеяй мог бы паўтарыцца. Перамовы між Нямеччынаю і СССР, па думцы Галуўка, уяўляюць небясьпеку як для Польшчы, так і для акраінных дзяржаў.

Гэтыя заявы кіраўніка ўсходняга дэпартаменту польскага міністэрства замежных спраў выклікалі адпаведныя водгукі ня толькі ў Літве і Нямеччыне, але і ў самой Польшчы. Зразумела, што хутка пасьледавала новая рэдакцыя абедзьвюх вышэйсьпамянёных гутарак, прычым Галуўка на простае запытаньне карэспандэнта „Известий ЦИК СССР" увёс некаторую яснасьць у вельмі няпэўную па сваёй палітычнай сутнасьці гутарку. Ён адказаў: **„Я баюся, што мяне ня так зразумелі, і лічу нелёгічнымі апасеньні Літвы, што Польшча будзе рабіць замах на незалежнасьць Літвы, у той час як Польшча—прыхільніца захаваньня незалежнасьці балтыцкіх дзяржаў. Калі-б яна захапіла Літву, дык тым самым яна-б паказала, што сама парушае свае прынцыпы. Я заяўляю, што Польшча ня імкнецца да вуніі з Літвою. Самай лепшай гарантыяй безапаснасьці балтыцкіх дзяржаў і самастойнасьці іх палітыкі, як у адносінах да СССР, так і ў адносінах да Нямеччыны, я лічу тое, аб чым вы пыталіся».**

(Карэспандэнт у сваім запытаньні падкрэсьліваў сувязь пытаньня аб адзіным фронце прыбалтыцкіх дзяржаў з тым, што гэтыя дзяржавы знаходзяцца між СССР і Нямеччынаю).

Намі пададзены ўсе гэтыя цытаты з тэй мэтай, каб зьвярнуць увагу нашага чытача на тое, што польска-літоўскія перамовы ў Коўні далёка выходзяць за межы звычайных перамоў між дзьвюма дзяржавамі, якія імкнуцца да ліквідацыі спрэчных пытаньняў. Адзін з кіраўнікоў польскае дэлегацыі ў сваіх заявах (з пэўнай праватою) на першае месца высунуў **міжнародны характар ковеньскіх перамоў.**

Тут і знаходзіцца той „Гордзіеў вузел", які абодвы бакі кожны ў сваіх інтарэсах, спрабуюць расьсячы ў Коўні. Польскі бок (гэткія камэнтарыі афіцыёзнага польскага друку і кіраўнікоў польскае замежнае палітыкі) імкнецца падкрэсьліць, што Польшча гатова зрабіць усё для таго, каб зьнішчыць уваемнае недавер'е і праднамераны погляд, які існуе ў абодвух бакоў і які зьяўляецца вынікам адсутнасьці кантакту ў працягу некалькіх гадоў". Аднак, польскі бок у той-жа час рашуча падкрэсьлівае, што спробы літоўскага боку ўзьніць, у зьвязку з перамовамі аб дагаворы аб ненападзе, пытаньне аб Віленшчыне, не дадуць ніякіх станоўчых вынікаў.

У сучасны момант пленарныя пасяджэньні канфэрэнцыі **адкладзены** да 25-га чэрвеня. Перамовы адновяцца пасьля сканчэньня працы камісій, арганізаваных у Кенігсбэргу. Адхіленьне Літвою польскага праэкту дагавору аб ненападзе, нежаданьне Польшчы зьвязаць з перамовамі, маючае актуальнае для Літвы значэньне, пытаньне аб Віленшчыне, мала дапамагаючыя добраму канцу перамоў камэнтарый польскае прэсы—усё гэта робіць вельмі рызыкоўным завяраньне аб тым, што польска-літоўскія перамовы могуць прывесьці да згоды абодвых бакоў. Гэта прымушае нас зноў з усёю сур'ёзнасьцю паставіць пытаньне аб тым, што пагроза абвастрэньня польска-літоўскіх дачыненьняў — гэта пагроза міру на ўсходзе Эўропы.

Крок да сацыялістычнае перабудовы вёскі.

Заснаваньне аддзелаў па працы на вёсцы пры партыкомах УсеКП(б).

Зьмяшчаем скарочаны зварот ЦК УсеКП(б) за подпісамі т. Молатава і загадчыка аддзелу працы на вёсцы т. Баўмана да ўсіх ЦК нацкампартый, бюро ЦК УсеКП(б), крайкомаў, абласных камітэтаў, акругкомаў і павятовых камітэтаў УсеКП(б).

15-ы партыйны зьезд паставіў ва ўсёй шырыні задачу сацыялістычнае перабудовы вёскі,—гаворыцца ў лісьце,—як непасрэдную задачу сучаснага пэрыяду новае эканамічнае палітыкі; дзеля ўзмацненьня працы на вёсцы ЦК ухваліў пастанову аб арганізацыі пры партыйных камітэтах аддзелаў па працы на вёсцы.

Праца партыі на вёсцы ў сучасных умовах набывае асабліва важнае значэньне. Цэнтральны Камітэт высунуў грандыёзную задачу пабудовы ў працягу бліжэйшых 3-4 гадоў новае сеткі буйных савецкіх гаспадарак на вольных не занятых землях з прадукцыяй таварнага хлеба каля 100 міліёнаў пудоў у год.

Пастановы 15-га зьезду па калектывізацыі выклікалі шырокі водгук у масах вясковае беднаты і сераднякоў: у працягу апошніх месяцаў заставаліся тысячы новых калектыўных гаспадарак.

Вопыт калектыўнага руху паказвае, што і на гэтым фронце барацьбы за сацыялізм **ЦАЛКАМ МАГЧЫМА І ТРЭБА** ажыцьцёвіць саюз пралетарыяту і вясковае беднаты з сярэднім сялянствам. Разам з тым, траба ўзьняць усю справу кіраўніцтва ўзрастаючым калектывістычным рухам як з боку каапэрацыйных органаў, так і з боку савецкіх і партыйных арганізацый. Кулацтва, якое ўзмацніла пры агульным эканамічным узьыме вёскі сваё становішча, аказвае ў моц разгортваньня калектывізацыі сельскае гаспадаркі рашучы адпор, імкнучыся весьці за сабою адсталыя гушчы сярэдняга сялянства. **НЕАБХОДНА З УСЁЮ РАШУЧАСЬЦЮ ДАМАГЧЫСЯ ПОЎНАЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ІЗАЛЯЦЫІ КУЛАЦТВА,** якое спрабуе зрываць сацыялістычнае будаўніцтва і перашкаджаць наступу пралетарскае дзяржавы на капіталістычныя элемэнты.

ЦК зварочвае асаблівую ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на неабходнасьць сапраўднага правядзеньня ў жыцьцё пралетарскае клясавае лініі савецкага законадаўніцтва і ўсіх мерапрыёмстваў, накіраваных на абмежаваньне росту капіталістычных элемэнтаў вёскі, на прыдушэньне эксплёататарскіх імкненьняў кулацтва і дапамогу беднаце. Траба кулацтва поўнасьцю і на справе падначаліць рэвалюцыйнай законнасьці. Неабходна ўзьняць на большую вышыню працу па арганізацыі і палітычнай асьвеце беднаты і батракоў, дамагаючыся ўсямернага ўмацаваньня саюзу з сераднякам проці кулака.

АДДЗЕЛЫ ПА ПРАЦЫ НА ВЁСЦЫ ПАВІННЫ: *дапамагчы партыйным камітэтам ажыцьцёвіць кіраўніцтва працаю дзяржаўных зямельных, крэдытных органаў і каапэрацыйных арганізацый*, у першую чаргу вельмі яшчэ слабое сельска-гаспадарчае каапэрацыі нізавога савецкага апарату і ўсіх грамадзкіх арганізацый вёскі (сялянскія камітэты ўзаемадапамогі, зямельныя таварыствы і т. д.) і сыстэматычна правярэць на сутнасьці, як праводзяцца гэтымі арганізацыямі партыйныя дырэктывы з пункту гледжаньня ажыцьцяўленьня партыйнае лініі. Не падменьваючы сабою ні ў якой меры савецкія, каапэрацыйныя і іншыя арганізацыі, *аддзелы па працы на вёсцы павінны быць* у курсе ўсіх асноўных мерапрыёмстваў па земляўпарадкаваньні, разгортваньні савецкіх гаспадарак, каапэраваньні і калектывізацыі сялянскае гаспадаркі і разьвіцьці сельскае-гаспадарчае індустрыі; *уважліва вывучаць і правяраць працу саветаў* і культурна-асьветных арганізацый на вёсцы, дамагаючыся больш шпаркага тэмпу ў ліквідацыі няпісьменнасьці і разьвіцьці культурна-асьветнае працы (хат-чытальняў, кіно, радыё і інш.) на вёсцы; з тэю-ж мэтаю *ажыцьцяўляць кіраўніцтва сялянскім пэрыядычным друкам* і выданьнем масавае сялянскае літаратуры; *кіраваць працаю груп беднаты*, склікаць нарады і канфэрэнцыі гэтых груп, ужываць захады дзеля больш шпаркага росту бяднацка-сераднацкага актыву; *правяраць пастаноўку справы вывучэньня сацыяльна-эканамічных працэсаў на вёсцы; дапамагаць наладжаньню праз адпаведныя органы растлумачэньня галоўных пастаноў партыі і ўраду* сярод сялянскіх мас; *браць удзел у вывучэньні, падбору і падрыхтоўцы кіруючых кадраў* працаўнікоў у розных галінах вясковае працы; *наладзіць правільную арганізацыю вылучэньня ўзрастаючых кадраў* сялянскага актыву, браць удзел у падрыхтоўцы кадраў спэцыялістаў для вёскі праз адпаведныя сельска-гаспадарчыя навучальныя ўстановы.

ЦК партыі прапануе ў працягу бліжэйшага часу **арганізаваць самастойныя аддзелы па працы на вёсцы пры ўсіх ЦК нацкампартый, крайкомах, абласных камітэтах, губкомах і акругкомах.** З прычыны асаблівае важнасьці працы на вёсцы, асабліва ў сучасны пэрыяд, ЦК прапануе вылучыць для працы ў аддзелах па працы на вёсцы ў якасьці загадчыка і адказных інструктароў адпаведна кваліфікаваных і аўтарытэтных працаўнікоў. Кандыдатуры загадчыкаў аддзеламі па працы на вёсцы ЦК нацкампартый, абласных камітэтаў і губкомаў у парадку часовае меры—павінны быць зацьверджанымі ЦК.

Ультра-левыя рэнегаты скаціліся ў багно меншавізму.

ПЕРАМОВЫ ЛІДЭРАЎ „ЛЕНІНБУНДУ" АБ УВАХОДЗЕ Ў ПАРТЫЮ САЦЫЯЛ-ПРАДАЖНІКАЎ.

Абманутыя рабочыя імкнуцца вярнуцца ў кампартыю

БЭРЛІН, 15-5. Пераважная большасьць рабочых, якія далучаліся да «Ленінбунду», імкнецца вярнуцца ў нямецкую кампартыю, некаторыя-ж лідэры зульскае групы «Ленінбунду» падрыхтоўваюць пераход да сацыял-дэмакратаў. Рэдактар газэты „Фольксвільле" Гейм вядзе перамовы з арганізацыямі сацыял-дэмакратычнае партыі аб пераходзе ў сацыял-дэмакратычную партыю. Ужо ў апошнім нумары «Фольксвільле», дзе падзагаловак—„орган „Ленінбунду"—ужо зьнік і заменен падзагалоўкам—„орган працоўных",—яўна падрыхтоўваецца пераход у сацыял-дэмакратычную партыю. Кандыдацкі сьпіс «Ленінбунду» на выбарах ужо абвешчан ліквідаваным. Кіраўнік арганізацыі «Ленінбунду» ў Гальле, Кіліян хадайнічаў перад ЦК сацыял-дэмакратычнае партыі аб прыёме яго ў гэтую партыю, але яму было зазначана, каб ён заставаўся пакуль-што ў «Ленінбундзе», бо яго дзейнасьць вельмі карысна для сацыял-дэмакратаў.

Сацыял-дэмакратычная партыя асыгнавала 45 тысяч марак на куплю газэты «Фольксвільле».

Вось вынікі трацкісцкага выраджэньня.

БЭРЛІН, 15-5. Орган нямецкае кампартыі „Ротэ Фанэ", абмяркоўваючы развал „Ленінбунду", піша: „Для таго, каб дасягнуць сёньнешніх вынікаў, банда нягодзікаў і ліга рэнегатаў ад Маслава да Ўрбанса ў працягу двох гадоў змагалася проці кампартыі, карыстаючыся для гэтага мэтадамі, якія ўжываюць сацыял-дэмакраты і буржуазея. Ціпер Урбанс і Бартэльс зьвярнуліся ў ЦК нямецкае кампартыі за дапамогаю. Само сабою зразумела, што нямецкая кампартыя зробіць усё, каб не зрабіць зульскіх рабочых вінаватымі ў злачынствах трацкісцкае кіруючае лігі. Але таксама зусім відочна, што ніякія ўчынкі Бартэльса і Ўрбанса ня могуць загладзіць іх віну за злачынствы, учыненыя імі перад рэвалюцыйным рухам".

* * *

БЭРЛІН, 15-5. У Зуле мясцовая паліцыя заняла памяшканьне газэты „Фольксвільле" (якая была да гэтага часу органам «Ленінбунду») пад тэю прычынаю, што рабочыя ў Зуле, якія вельмі абураны прадугледжваемай перадачай «Фольксвільле» сацыял-дэмакратам, „могуць учыніць напад на памяшканьне газэты». Паліцыя дзейнічала па загаду ўрадавага акругавага начальніка, які зьяўляецца членам сацыял-дэмакратычнае партыі і кіраваў перамовамі між сацыял-дэмакратамі і групаю Гейма (рэдактар „Фольксвільле", які падрыхтоўвае разам з усёю групаю пераход у сацыял-дэмакратычную партыю).

У Зуле адбыўся масавы сход, скліканы кампартыяй, які быў асабліва шматлюдным, і на якім прысутнічала шмат рабочых, якія належалі і раней да ультралевых. Сход аднагодна ўхваліў рэзалюцыю падтрымліваць нямецкую кампартыю і Савецкі Саюз.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Антыпралетарская місія ППС ў варшаўскім магістраце.

ВАРШАВА, 15-5. Дэпутаты Бунду ў гарадзкім самакіраўніцтве Варшавы прапанавалі асыгнаваць 10 тысяч злотых на дапамогу сем'ям рабочых, якія сталі ахвярамі нападу пэпэсаўскіх дружыньнікаў на першамайскую дэманстрацыю ў Варшаве.

Дэпутаты ППС адмовіліся падтрымаць гэтую прапанову.

Некаторыя даныя аб польскім войску.

У Польшчы маецца 3 корпусы кадэтаў: у Львове 5-клясавы (360 вучняў), у Холме—5-клясавы (540 вуч.) і ў Равічу 2-хклясавы (240 вуч.).

Польскаму войску не хапае яшчэ 20 тыс. коняй.

Лік яўрэяў у польскім войску раўняецца 15.263 салдатам, ці звыш 5 проц. усяго складу войска.

Польшча будуе марскі флёт.

Польскі бюджэт, пададзены у сойм, прадугледжвае выдатак 30 млн. злотых на пабудову польскага ваеннага флёту.

«Кур'ер Варшаўскі», разглядаючы гэтую справу, выказвае думку, што выдаткі на ваенны флёт у суме 30 міліёнаў зьяўляюцца дарэмнымі, таму што Польшча ўсё роўна ня зможа абараніцца на моры. «К. В.» лічыць, што гэтыя 30 млн. лепш было-б аддаць на паветраны флёт.

АХВЯРА РЭЖЫМУ ПІЛСУДЧЫНЫ.

ВАРШАВА, 15-5. 13 мая ў сасновішкім астрозе скончыў жыцьцё самагубствам палітычны зьняволены Гроднецкі, абвінавачваемы ў камуністычнай дзейнасьці.

АРЫШТ ТЭРАРЫСТА.

«Дзеньнік Віл.» (№ 109) паведамляе, што ў Дзярэчыне паліцыя арыштавала тэрарыста Я. Зубрыка, якога даўно шукалі. Зубрык абвінавачваецца ў цэлым шэрагу арганізаваных ім збройных выступленьняў проці паліцыі.

ЗЬЕЗД БЕЛАПОЛЬСКІХ ВАЙСКОВЫХ.

12-га мая ў Варшаве адчыніўся зьезд б. прэзыдыумаў саюзаў вайсковых палякаў у Расеі. Зьезд адчыніўся пры значным удзеле дэлегатаў і прадстаўнікоў польскага войска. Старшынёю зьезду абраны віленскі ваявода Рачкевіч. Зьезд вітаў між іншым і прадстаўнік Пілсудзкага.

ПАБУДОВА ПАШТОВА-МЫТНАГА БУДЫНКУ Ў СТОЎБЦАХ.

«Слово» (№ 109) паведамляе, што 20 мая г. г. будзе дабудованы пры ст. Стоўбцах новы дом для пошты і мытніцы.

НОВЫ ЧЫГУНАЧНЫ МОСТ У СТОЎБЦАХ.

15 мая павінна была адбыцца проба другой часткі пераабудаванага жалезнага чыгуначнага мосту ў Стоўбцах.

Пабудова гэтага мосту будзе мець значэньне як для чыгункі, так і для сплаву па Нёмне, бо падпоры старога дрэўнянага мосту перашкаджалі сплаву і суднаходзтву.

РЭПРЭСІІ ЗА БАЙКОТ «НАЦЫЯНАЛЬНАГА СЬВЯТА».

У Станіслававе школьная адміністрацыя зачыніла 3 клясы гімназіі за тое, што вучні яе—украінцы—збайкатавалі сьвята 3 мая (дзень заснаваньня польскае дзяржавы).

ПАШЫРЭНЬНЕ ЗАБАСТОВАЧНАГА РУХУ Ў ІНДЫІ.

ЛЁНДАН. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што да забастоўкі тэкстыльных рабочых у райёне Калькуты далучыліся рабочыя 22-х джутавых фабрык у Касіноры і Чытбары ў ліку 15-ці тысяч чалавек. Рабочыя дамагаюцца павялічэньня заработку.

Новыя крэдыты СССР у Аўстрыі.

ВЕНА. «Абэнд» паведамляе, што фінансавая ўправа муніцыпалітэту гор. Лінцу бярэ ўдзел у гарантаваньні аўстрыйскага экспорту ў СССР на суму 3 міліёны шылінгаў.

Дэтэрдынг біты.

ЛЁНДАН. Кампанія «Дэйлі Мэйль» проці продажу савецкіх нафтавых прадуктаў у Англіі праваліласся. Лібэральны орган „Тас" зазначае, што ў выніку кампаніі ангельскія аўтамабілісты купляюць савецкіх нафтавых прадуктаў у 2-3 разы больш, чымся перад пачаткам кампаніі.

Перадвыбарчая гарачка ў Нямеччыне.

МЕНШАВІКІ ІДУЦЬ З МЫЛАМ ДА ВЫБАРШЧЫКАЎ.— ЖВАВАЯ АГІТАЦЫЯ ЗА КАМУНІСТЫЧНЫЯ СЬПІСЫ.

БЭРЛІН, 15-5. У параўнаньні з ранейшымі выбарамі, у тым ліку і з выбарамі 1924 г., сучасная выбарчая кампанія зьяўляецца значна больш спакойнаю. Тэхнічныя сродкі прапаганды—самалёты, перасовачнае кіно, грамафоны, вандроўныя трупы і г. д.,—сёлета ўжываюцца больш, чымся раней. Бэрлінская арганізацыя сацыял-дэмакратычнае партыі ўжыла нават у якасьці агітацыі раздачу кавалкаў мыла з адпаведнымі надпісамі.

13-га мая надзвычайна жвавую агітацыю па ўсім краі правялі камуністычная партыя і чырвоны саюз франтавікоў. Шматлікія калёны з агітацыйнымі лёзунгамі праходзілі па ўсіх самых далёкіх вёсках. У Бэрліне ў розных райёнах адбыліся сходы, вулічныя дэманстрацыі і працэсіі.

Кіраўнікі ўсіх партый з мэтаю перадвыбарчае агітацыі разьяжджаюць па правінцыі.

Саксонскія мэталёўцы ня спыняюць барацьбы.

БЭРЛІН, 12-5. Рабочыя саксонскае мэталёпрамысловасьці ня спыняюць забастоўкі, наперакор патрабаваньням рэфармісцкіх лідэраў адналіць працу пасьля абвяшчэньня трацейскае пастановы абавязковаю.

Разрыў выдатнага рэфармісцкага дзеяча з сац.-дэмакратыяй.

БЭРЛІН, 15-5. Старшыня праўленьня мясцовае арганізацыі ўсенямецкага аб'яднаньня прафэсыянальных саюзаў ў Штальюцэне (Усходняя Прусія) Энскат заявіў аб сваім уваходзе ў нямецкую камуністычную партыю і агаласіў заяву, у якой вазначае, што рашучым штуршком да палявеньня яго палітычных поглядаў было наведаньне ім СССР у якасьці члена трэцяе рабочае дэлегацыі. У часе падарожжа ў СССР Энскат асабіста пераканаўся ў штучнасьці паклёпу нямецкіх сацыял-дэмакратаў на СССР.

Канчаткова Энскат парваў з сацыял-дэмакратамі пасьля адмовы сацыял-дэмакратаў падтрымаць праэкт амністыі пралетарскім палітычным зьняволеным.

ЗАКЛІК НЯМЕЦКАЕ „ВЭЛЬТ АБЕНД" У АБАРОНУ ГРАМАДЫ.

(Ад уласнага бэрлінскага карэспандэнта).

БЭРЛІН, 12-5. Сёньнешняя радыкальная «Вэльт Абэнд» зазначае на блізкасьць канца працэсу Грамады і заклікае нямецкую грамадзкасьць у апошні момант пратэставаць проці крывавага прасьледаваньня палякамі беларусаў і проці грамадзкага працэсу.

Нанкінцы ўвайшлі ў Цянцьзін.

ШАНХАЙ, 15-5. Тэлеграфнае агенцтва нанкінскага ўраду агалашае паведамленьне палявога штабу паўднёвае арміі, што авангард паўднёвага войска ўвайшоў у аколіцы Цянцьзіну

Падрабязнасьці цзынаньскіх падзей.

Зьмест нанкінскае ноты у Лігу Нацый.

БЭРЛІН. З Жэневы надаслан тэкст ліста нанкінскага ўраду да генэральнага сэкратара Лігі Нацый наконт цзынаньскага інцыдэнту.

У лісьце зазначана:

3-га мая японскае войска ў Цзынані распачало страляніну па кітайскіх салдатах і цывільным жыхарстве без усякае падставы з іх боку. Пасьля гэтага японскае войска бамбардыравала квартал га суседзтве з месцам распачатых ваенных апэрацый, прычым было забіта і паранена больш тысячы чалавек. Атрад японскіх салдат уварваўся ў памяшканьне нашага ўпаўнаважанага па замежных справах ў Цзынані, адрэзаў яму вушы і нос і тут-жа расстраляў яго разам з 3-мя яго супрацоўнікамі.

7-га мая японская вайсковая ўлада ў Цзынані перадала нашаму вярхоўнаму галоўнакамандуючаму ноту з неразумнымі і неажыцьцявімымі патрабаваньнямі, патрабаваўшы праз 12 гадзін даць адказ на гэтую ноту. Не чакаючы адказу, японскае войска аднавіла варожыя апэрацыі, якія ня спынены і да гэтага часу. Японцы пасылаюць новыя сухапутныя і марскія сілы на кітайскую тэрыторыю.

ПАЛІТЫЧНАЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ КІТАЮ ПАРУШАНА САМЫМ ГРУБЫМ ПАРАДКАМ. Выступленьне японцаў стварае пагрозу міру. Мы вельмі просім, каб Ліга Нацый прапанавала Японіі спыніць варожыя ўчынкі проці Кітаю і адклікаць японскае войска з правінцыі Шандунь. Нацыянальны ўрад выказвае згоду на міжнароднае расьсьледваньне інцыдэнту або на назначэньне трацэйскага суду.

Японскае ультыматыўнае патрабаваньне.

ТОКІЁ. 15-5. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе: «Японскае вайсковае міністэрства прапанавала начальніку японскіх экспэдыцыйных войск у Шандуньскай правінцыі генэралу Дукуда патрабаваць у кітайскае улады: 1) фармальнага прабачэньня з боку Чан-Кай-Шы за цзынаньскі інцыдэнт; 2) пакараньня генэрала Хо-Яо-Цзу і іншых асоб, адказных за цзынаньскія падзеі; 3) спыненьня варожых ваенных апэрацый у 20-імільнай паласе ўздоўж Цындао-Цзынаньскае і Цзынаньска Цянцьзінскае чыгункі.

ЯК У ЗАВАЁВАНЫМ КРАІ...

ШАНХАЙ, 15-5. Водлуг паведамленьняў газэты «Сін Ван Бао», японскае войска 15-га мая ўчыніла ў Цындао наскок на ўнівэрсытэт Чылю, арганізаваны амэрыканцамі. Японцы арыштавалі шмат настаўнікаў і студэнтаў унівэрсытэту.

РАЗЬНЯ Ў ЦЫНДАО.

ШАНХАЙ, 15-5. Карэспандэнт газэты «Чайна Таймс" паведамляе, што ў Цындао ў часе цзынаньскіх падзей было забіта звым 3 тысяч кітайскіх жыхароў.

ПАЎДНЁЎЦЫ АДПЛЫЛІ АД АМОЮ.

ШАНХАЙ, 15-5. Газэта «Сін Ван Бао" паведамляе, што судны паўночнага вайсковага флёту, бамбардыраваўшыя ўчора фарты Амой (угаворы порт на поўдні Фуцьзянскае правінцыі) і заняўшыя выспу Цьзінь мынь, сёньня адступілі.

На міжнароднай выстаўцы друку.

Вялічэзная цікавасьць да савецкага аддзелу.

КЕЛЬН, 14-5. Першае ўражаньне ад адчыненае ў Кельне міжнароднае выстаўкі кажа, што выстаўка дае наглядны і шырокі малюнак арганізацыі і дзейнасьці сувьеткае прэсы. Большасьць аддзелаў выстаўкі яшчэ не адчынілася. Падрыхтоўчая праца ў большасьці аддзелаў будзе скончана ў працягу бліжэйшых тыдняў. Аднак, ужо і зараз можна ўстанавіць, што падбор экспанатаў на выстаўцы адбываўся па такіх двух напрамках: 1) культурна-гістарычнае разьвіцьцё прэсы і 2) тэхніка паліграфічнае вытворчасьці. У першым напрамку арганізатары выстаўкі паставілі задачаю адзначыць найбольш важныя моманты з гісторыі разьвіцьця друку. Надзвычайна цікавыя экспанаты тэхнічнага аддзелу выстаўкі, дзе сабраны ўсе прылады паліграфічнае вытворчасьці ад самых звычайных машын да самых складаных друкарскіх гігантаў сучаснасьці.

Меншае ўражаньне пакідаюць тыя экспанаты выстаўкі, якія павінны паказаць сувязь прэсы з грамадзкім ладам. У гэтых адносінах значны прабел папаўняецца савецкім аддзелам выстаўкі, экспанаты якога яскрава адбіваюць сацыяльнае жыцьцё Савецкага Саюзу. Поруч з гэтым у савецкім аддзеле добра прадстаўлена і гісторыя расейскае прэсы. На першы плян высунута нелегальная расейская прэса. На выстаўцы адбіта барацьба ў СССР—за плянавую гаспадарку, індустрыялізацыю і электрыфікацыю, стан працы і сацыяльнага страхаваньня і г. д.

Асабліва зьяўляюцца цікавымі для Заходняй Эўропы экспанаты з галіны супрацоўніцтва і сувязі між газэтамі і іх чытачамі, г. зн. матар'ял аб рабкорах, селькорах, ваенкорах і інш. Вялікае месца аддзена таксама адбітку жыцьця нацыянальнасьцяў СССР.

Праца ў савецкім павільёне мае быць скончана 25-га мая. Аднак, ужо ў першы дзень адчыненьня выстаўкі сярод наведвачых наглядалася зусім выключная зацікаўленасьць да савецкага аддзелу.

Кулямёты і газы проці гарнякоў Огайё.

КАПІТАЛІСТЫ СКЛАДАЮЦЬ УЗБРОЕНЫЯ ШТРЭЙКБРЭХЕРСКІЯ ДРУЖЫНЫ З БАНДЫТАЎ.

НЬЮ-ЁРК. Гэтымі днямі ў сьледчай камісіі былі заслуханы паказаньні кіраўніка аднае капальні ў штаце Огайё, які, між іншым, паведаміў, што ўласнікі гэтае капальні трымаюць на свае сродкі спэцыяльна ўзброены атрад для барацьбы з гарнякамі. Гэты атрад навербаваны з розных падазроных асоб і ўзброен, як кажа кіраўнік капальні, кулямётамі, вінтоўкамі, сьлёзатачывымі бомбамі і рэвальвэрамі з газавымі кулямі.

СПАДРУЧНЫЯ ГРЫНА ЗРЫВАЮЦЬ БАРАЦЬБУ ГАРНЯКОЎ.

НЬЮ-ЁРК, 15-5. Зьезд фэдэрацыі працы штату Пэнсільванія, які адбыўся гэтымі днямі, прайшоў палком пад уплывам правых рэфармісцкіх. Зьезд ухваліў рэзалюцыю проці арганізаванага левым крылом прафсаюзу горнарабочых „камітэту выратаваньня саюзу" і проці арганізаваных тым-жа крылом камітэтаў дапамогі бастуючым горнарабочым. Разам з тым, ухвалена рэзалюцыя, якая далком згодна з палітыкаю рэакцыйнага старшыні прафсаюзу горнарабочых Льюіса.

У САЮЗЕ ССР.

СПАТКАНЬНЕ АМАНУЛЫ-ХАНА Ў СЭВАСТОПАЛІ

СЭВАСТОПАЛЬ, 15-V. Падышах з жонкаю, членамі сям'і і сьвітаю прыбыў у Сэвастопаль. Перад прыходам поезду на пэрроне сабраліся члены ўраду на чале з старшынёю Крым. ЦВК-а т. Кубаевым і прадстаўнікі вайсковае ўлады і камандаваньня Чорнаморскім флётам. Пасьля выхаду падышаха з вагону т. Карахан прадставіў яму т. Кубаева, вітаўшага падышаха і жонку ад імя крымскага ўраду. Пасьля адказнага прывітаньня падышах абыйшоў ганаровую варту, вітаючыся з чырвонаармейцамі.

Прах т. Ляндлера ў Маскве.

МАСКВА, 15-5. 15-га мая ў Маскву прыехалі жонка і дачка памёршага сэкратара вэнгерскае кампартыі тав. Ляндлера, якія прывезьлі вурну з прахам нябожчыка. На вакзале іх сустралі вэнгерскія палітэмігранты і шматлікія прыяцелі нябожчыка.

Пахаваньне Ляндлера адбудзецца ў часе адчыненьня кангрэсу Камінтэрну.

Кандыдаты ў акадэмікі

ЛЕНІНГРАД, 15-5. Савет ленінградзкага унівэрсытэту высунуў кандыдатуры ў сапраўдныя члены акадэміі навук т. т. **Бухарына, Пакроўскага, Разанава, Дзборына, Хвальсона, Абручова, Фрычэ** і інш.

Хлебазагатоўкі павялічыліся.

МАСКВА, 15-5. Водлуг дакладных даных НК Гандлю СССР, у другой пяцідзёўцы мая загатавана 39.170 тон хлебапрадуктаў проці 17.570 тон, загатаваных у першай пяцідзёўцы.

НОВАЕ У МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ.

(З прамовы т. Галадзеда на I усебеларускім зьезьдзе Авіяхіму).

Нямеччына патроху адыходзіць ад Рапальскага дагавору.

Што характэрна ў палітыцы Нямеччыны? У палітыцы Нямеччыны мы можам адзначыць той факт, што Нямеччына патроху адыходзіць ад Рапальскага дагавору, дагавору ўтворанага з СССР, і ўсё больш у сваёй палітыцы пачынае імкнуцца на Захад.

Бязумоўна, мы можам адзначыць у Нямеччыне ўзмацненьне тэнденцыі на збліжэньне з Францыяй, Англіяй і паслабленьня ці нават разрыву сувязі з СССР. Гэты досыць сурёзны штрых у нямецкай палітыцы гаворыць аб тым, што тая самастойнасьць у нямецкай палітыцы ў адносіне да СССР, якая мелася раней, зараз парушана і падпадае ў пэўнай частцы, праўда, ня поўнасьцю, уплыву заходня-эўрапэйскіх капіталістаў—гэта значыць, Англіі, Францыі і г. д.

Вось вузлавы пункт, які зьяўляецца вельмі характэрным у палітыцы Нямеччыны.

Чым можна пацьвердзіць гэткую формулу? Я думаю карыстацца наступнымі фактамі: напрыклад, спыненьне перамоў аб гандлёвым дагаворы з СССР.

Раней нашы гандлёвыя звароты з Нямеччынай былі большыя, чымся з іншымі дзяржавамі; частка ўрадавых нямецкіх колаў і зараз яшчэ бярэ напрамак на пашырэньне гэтых гандлёвых сувязяў з намі, але значная частка буржуазеі, галоўным чынам, прадпрыёмцаў на чале з графам Кюльманам, яўна імкнецца на Захад, і ў выніку гэтага нашы перамовы былі сарваны. Праўда, нямецкая буржуазея высунула пры гэтым іншы матыў, зьвязаны з тым, што пры выкрыцьці намі шахцінскай контр-рэвалюцыйнай змовы было арыштавана некалькі інжынэраў, нямецкіх падданых, якія прымалі ўдзел у гэтай справе. Але, зразумела, справа ня ў тым, што трое ці пяцёра контр-рэвалюцыянэраў аказаліся нямецкімі падданымі і былі арыштаваны; тут справа больш глыбокая: некаторыя, асабліва прамысловыя колы Нямеччыны пачалі кіравацца на Захад.

Затым мы бачым, што ўсё больш узмацняецца антысавецкі настрой у нямецкай прэсе. Яна досыць вяўніча пачала выступаць у зьвязку з арыштам некалькіх нямецкіх падданых па шахцінскай справе (зараз, праўда, замаўчала), яна таксама досыць востра выступала адносна перарыву перамоў аб гандлёвым дагаворы, абвінавачваючы ў гэтым Савецкі Саюз. Закулісная праца ў Нямеччыне ўсё больш і больш узмацняецца супроць СССР. Напрыклад, той-жа граф Кюльман садзейнічае лёрду Біркенхэду, які носіцца з сваімі плянамі стварэньня антысавецкага блёку, а ён-жа ў сваю чаргу ня раз езьдзіў у Англію з гэтай-жа мэтаю.

Можна меркаваць, што актыўнасьць нямецкай палітыкі была значна большай, калі-б Нямеччыне не перашкаджалі надыходзячыя зараз перавыбары. Мы ведаем, што нямецкі пралетарыят нагэтулькі арганізаваны, што з ім жартаваць нават такому ўраду, які зараз знаходзіцца ў Нямеччыне, вельмі небясьпечна. Вось вам прыклад: надумаў урад распусьціць нямецкі саюз чырвоных франтавікоў. Гэта досыць магутная арганізацыя, якая яднае лепшыя шэрагі пралетарыяту і цалкам працуе з камуністычнай партыяй. Але як толькі міністр унутраных спраў Нямеччыны надумаў распусьціць гэтую арганізацыю, зараз-жа спаткаў адпор, бо нямецкі пралетарыят з рэдкім аднадушшам выступіў на абарону гэтага саюзу.

Вам можа здавацца як быццам нелёгічнай гэта зьмена курсу нямецкай палітыкі, калі ўспомніць яе паводзіны на Жэнеўскай канфэрэнцыі па разброеньні, дзе Нямеччына актыўна падтрымлівала наш праэкт. Але гэта тлумачыцца проста. Справа тут ня ў тым, што нямецкія капіталісты сапраўды цалкам ідуць з намі ў агульнай палітыцы, а ў тым, што ім проста выгадна было абараняць праэкт усеагульнага разброеньня. Нямеччына па Вэрсальскаму дагавору абмежавана ў сваім узбраеньні, у той час, як яе ворагі маюць неабмежаванае ўзбраеньне. Таму гэткі праэкт, які-б абмяжоўваў узбраеньне ворагаў, для Нямеччыны вельмі выгадны. Вось чаму, мабыць, Нямеччына так ахвотна бараніла наш праэкт на Жэнеўскай канфэрэнцыі.

Нелёяльнасьць польскае палітыкі да СССР.

Асноўныя пункты польскай палітыкі, нашай бліжэйшай суседкі, мы ахарактарызуем наступным чынам: зараз заходня-эўрапэйскія магнаты вядуць працу па ўцягненьню Польшчы пад уплыў Англіі, прычым гэта робіцца і праз скарыстаньне для гэтай мэты Італіі. Таксама ўзядзецца праца па паслабленьню пазіцый Францыі ў Польшы, аб чым ужо гаварылася раней.

Чаму гэта палітыка ўцягненьня Польшчы пад уплыў Англіі праводзіцца праз Італію, адкуль гэта відаць? Гэта відаць хоць бы з таго, што міністр замежных спраў Польшчы Залескі езьдзіў нядаўна ў Рым да Мусаліні. Зразумела, ён езьдзіў туды не таму, што Рым гэта—курортнае месца. Зусім не таму.

Італія зараз, як я ўжо казаў, грае досыць вялікую ролю як зброя ў руках Англіі ці разам з Англіяй па ўцягненьню асобных дзяржаў Заходняй Эўропы, сумежных з намі, у антысавецкі блёк. І Залескі езьдзіў у Італію толькі для таго, каб спрабаваць больш зьвязацца з Англіяй, каб спрабаваць паслабіць уплыў Францыі ў Польшчы і ўзмацніць гэты ўплыў з боку Англіі.

Яшчэ можна заўважыць вельмі цікавае зьявішча ў польскай палітыцы: у польскім друку ў апошнія месяцы, у зьвязку з тымі тэнденцыямі, якія намячаюцца па збліжэньню Францыі з Нямеччынай, вельмі яскрава выяўляецца думка аб так званай «перастрахоўцы Польшчы», г. зн. аб замацаваньні за Польшчай яе сучасных тэрытарыяльных граніц, якія былі вызначаны ў выніку перамогі Антанты над Нямеччынай. Польскі друк ставіць пытаньне, што калі Нямеччына думае зблізіцца з заходня-эўрапэйскімі дзяржавамі, дык гэта для Польшчы стварае вялікую пагрозу. Польшча разумее, што збліжэньне Францыі з Нямеччынай ці Англіі з Нямеччынай азначае па сутнасьці перагляд заходніх граніц Польшчы і ўсходніх граніц Нямеччыны.

Таксама, як адзін з галоўных пунктаў польскай палітыкі мы можам адзначыць і падкрэсьліць нелёяльнасьць польскай палітыкі ў адносіне да СССР. Гэта нелёяльнасьць польскай палітыкі ў адносіне да СССР застаецца і да сучаснага моманту. У чым гэта выяўляецца? Гэта выяўляецца ў тым, што да гэтага часу, ня гледзячы на цэлы шэраг нашых прапаноў, мы яшчэ ня маем дагавору з Польшчай аб ненападзе, а таксама гандлёвага дагавору; нават не распачалі дзелавых перамоў, хоць мы актыўна прапанавалі Польшчы і прапануем распачаць дзелавыя перамовы. Патэк езьдзіць з Масквы ў Варшаву і яшчэ пара чыноўнікаў з міністэрства замежных спраў падарожнічаюць у зьвязку з гэтай справай, але гэтым справа канчаецца. Апроч таго, мы бачым, што гэта нелёяльнасьць яскрава выяўляецца ў апекаваньні Польшчы тымі контр-рэвалюцыянэрамі, тымі адкідамі чалавецтва, тымі наймітамі Англіі, якія знаходзяцца ў Польшчы.

Возьмем апошнія адзінаццаць месяцаў; за гэтыя адзінаццаць месяцаў мы мелі: забойства Войкава, у верасьні 1927 г. замах Трайковіча на нашага саўпэтніка Ўльянава, замах Валентовіч на нашага паўнамоцнага прадстаўніка. (Гэтая самая Валентовіч была арыштавана, але ў хуткім часе вызвалена); нарэшце, замах Вайцахоўскага на нашага гандлёвага прадстаўніка Лізарава (рыхтаваўся замах на паўнамоцнага прадстаўніка).

Гэтыя факты, якія адбыліся на працягу 11 месяцаў гавораць аб тым, што з боку польскага ўраду вядзецца апякунская палітыка да ўсякіх адкідаў, якія ў Польшчы аселе, якія вядуць контр-рэвалюцыйную барацьбу і за ангельскія грошы імкнуцца ажыцьцяўляць міжнародную палітыку Англіі.

Мы ў мінулым годзе, пасьля забойства Войкава, ставілі пытаньне аб выслапьні асабліва актыўных белагвардзейцаў з Польшчы. Мы гэта высунулі галоўным пунктам у нашай ноце, мы зазначылі, што калі польскі ўрад гаворыць, што ён да нас мірна настроен, калі ён хоча мець з намі дзелавыя ўзаемаадносіны, ён павінен ачысьціць увесь край ад усякіх адкідаў, якія перашкаджаюць нашай мірнай працы. Польскі ўрад тады нібы згадзіўся выканаць наша патрабаваньне: ён пачаў высылаць, але аказваецца, што ён спачатку выслаў, а пасьля частку зноў вярнуў, спачатку некаторых арыштаваў, але пасьля вызваліў. Мы разумеем, што гэта азначае ня больш ня менш, як апякунскую палітыку ў адносіне да гэтых прахвостаў, ангельскіх наймітаў. Як-жа інакш можна разглядаць тое, што на працягу 11 месяцаў мы маем 4 замахі на нашых савецкіх прадстаўнікоў? Нават у самых заядлых буржуазных, фашысцкіх краінах мы ня бачылі, каб былі такія тэрарыстычныя адносіны да нашых прадстаўнікоў, як мы гэта бачым у Польшчы.

Гэта, бязумоўна сьведчыць аб **яўнай нелёяльнасьці польскага ўраду да Савецкага Саюзу.**

Адным з галоўнейшых пунктаў, які бясспрэчна мае характар міжнароднага, трэба адзначыць перамовы Польшчы з Літвой—Пілсудзкага з Вальдэмарасам. Склікалася спэцыяльная канфэрэнцыя, цэлы шэраг нарад, але пакуль што яны не далі ніякіх вынікаў. Мне здаецца, што ў гэту справу ўжо ўмяшаўся Лёндан, бо апошнія весткі з друку гавораць аб тым, што Вальдэмарас «запрошан» ці нават проста выклікан у Лёндан. Мне здаецца, што пасьля звароту яго з Лёндану ён будзе больш згаворлівым з польскім урадам, бо гэта ёсьць нішто іншае як крок з боку ангельскага кансэрватыўнага ўраду зрабіць нажым на літоўскі ўрад, каб ён быў больш згаворлівым у адносіне да Польшчы.

Рэвалюцыйны фронт, наступленьне фашызму і працэс над Грамадой.

Але мы ўсё-ткі гаворым, што антысавецкі блёк арганізуецца. Што мы яму супроцьставім? Апроч нашай дыпляматы мы супроцьставім яму, папершае, адзіны фронт пралетарскага руху. Гэта—наша галоўная мощ, якая дапанагае паслабляць гэты блёк—арганізацыя адзінага пралетарскага фронту ва ўсім сьвеце.

Апроч таго мы вялі і ў далейшым вядзем палітыку, якая заўсёды была правільнай і застанецца правільнай: палітыку спачуваньня і маральнай дапамогі прыгнечаным нацыянальнасьцям, прыгнечаным народнасьцям. Гэта таксама дапамагае разьбіваць антысавецкі блёк і паслабляць нашых ворагаў.

Нашай палітыкай прызнаньня барацьбы прыгнечаных нацыянальнасьцяй за сваё вызваленьне і самастойнасьць мы ўздымаем міліённыя пласты на агульную арэну сусьветнай палітыкі, і гэтыя вялізарныя пласты народных мас, якія раней спалі, з якімі ангельскі імпэрыялізм што хацеў то і рабіў, вырываюцца з-пад гэтай імпэрыялістычнай вузды. Таму мы, Савецкі Саюз, карыстаемся і сустракаем вялікую сымпатыю з боку ўсіх гэтых прыгнечаных нацыянальнасьцяй.

Вось наша галоўная зброя барацьбы за мір.

Капіталістычныя-ж дзяржавы, якраз наадварот вядуць палітыку прыгнечаньня малых народнасьцяй. Напрыклад, характэрнай зьяўляецца палітыка польскага фашысцкага ўраду ў адносіне беларускай нацыянальнай меншасьці ў Польскай дзяржаве. З друку вы ведаеце, што ўжо каля двох месяцаў польскі ўрад судзіць беларускі народ, судзіць за тое, што перадавыя прадстаўнікі гэтага прыгнечанага народу баранілі права на сваё існаваньне і культурнае разьвіцьцё. Няма чаго і гаварыць аб тым, што польскі ўрад ня мае і ня можа мець ніякіх фактаў аб выдуманай ім сувязі Камінтэрну і СССР з рэвалюцыйным рухам у Заходняй Беларусі. Па тону, які праглядае ў польскім друку, відаць, што на гэтым працэсе польскі ўрад, бязумоўна, прайграе, бо скампрамэтаваць народна-рэвалюцыйны рух падтасоўкаю фактаў яму няўдасца, ня гледзячы на ўсе стараньні. Агенты дэфэнзывы, пастаўленыя разгорнутым фронтам на сфабрыкаваньне справы Беларускай Грамады, аказаліся зусім бясьсільнымі выдумаць што-небудзь сур'ёзнае, што-б скампрамэтавала гэту рэвалюцыйна - сялянскую арганізацыю. Ня толькі працоўныя Савецкага Саюзу, але і ўсяго сьвету, усе лепшыя прадстаўнікі, якія маюцца ў заходня-эўрапэйскіх дзяржавах, узьнялі свой голас пратэсту супроць зьдзекаў польскага фашызму над беларускім народам. Газэты з кожным днём прыносяць ўсё новыя і новыя весткі аб пратэстах нават з боку буржуазна-рэвалюцыйных дзеячоў (пісьменьнікаў, літаратараў, грамадзкіх дзеячоў і г. д.). Гэта сьведчыць аб тым, што сфабрыкаваны дэфэнзываю працэс над беларускім народам выклікаў усеагульнае абурэньне з боку рэвалюцыйных, культурных, грамадзкіх арганізацый і асобных дзеячоў заходня-эўрапэйскіх дзяржаў.

Мы яшчэ ня ведаем, які будзе прысуд, але тыя факты і матар'ялы, якія высоўваліся ў судзе, гавораць за тое, што падсудных, лепшых прадстаўнікоў беларускага народу ў Заходняй Беларусі, пры найменшай дозе аб'ектыўнасьці нават буржуазная юстыцыя прызнала-б невінаватымі, а суд польскай буржуазеі і фашызм, зразумела, пастараецца расправіцца з імі.

З усёй гэтай справы мы можам зрабіць пэўны вывад, што ніякіх абавязацельстваў у адносіне нацыянальных меншасьцяй у Польшчы польскі ўрад ня выконвае.

Некалькі слоў адносна рэвалюцыйнага фронту. Што мы тут бачым? У частцы разгортваньня рэвалюцыйнага руху, камуністычнага руху мы бачым кансалідацыю рэвалюцыйных сіл. Напрыклад, выбары, якія адбыліся ў Францыі, Польшчы і іншых краінах: мы бачым там усё большы і большы ўплыў камуністычнай партыі на шырокія рабочыя масы.

Праўда, мы адначасна бачым і іншае, што фашызм з свайго боку таксама актывізуецца; напрыклад, прадвыбарчы тэрор з боку польскага ўраду, напрыклад, прасьледваньне камуністычных дэпутатаў і г. д. У газэце вы маглі прачытаць, што польскі фашысцкі сойм выдае суду дэпутата Сахацкага.

Усё гэта гаворыць за тое, што пралетарскія сілы кансалідуюцца, але з другога боку і фашызм таксама ўзмацняе рэпрэсіі ва ўсёй Заходняй Эўропе, прычым ён ажыцьцяўляе гэта праз сацыялістычных здраднікаў. Сіла фашызму ў тым, што ён здолеў у сябе на службе паставіць шмат прахвостаў, шмат сацыял-здраднікаў. І вось, у выніку гэтага мы бачым, што, напрыклад, першамайская дэманстрацыя ў Варшаве адзначылася дзесяткамі ахвяр рабочых, прычым гэтыя ахвяры зьявіліся ў выніку злой волі так званай «сацыялістычнай» партыі—ППС: дружыньнікі з ППС пачалі страляць у рабочую дэманстрацыю. Гэта зрабілі дружыньнікі тэй партыі, якая, як верная сабака, служыць фашысцкаму ўраду Пілсудзкага. Тое-ж мы можам наглядаць і ў Францыі.

Але ўсё гэта не азначае, што фашызму і сацыял-здраднікам удасца затрымаць кансалідацыю сіл, якая адбываецца зараз у галіне пралетарскага рэвалюцыйнага руху. Мабыць не адзін май ня бачыў яшчэ такіх дэманстрацый, якія былі сёлета ва ўсіх буйных пралетарскіх цэнтрах Заходняй Эўропы. І, зразумела, гісторыя ня ведала яшчэ такога выпадку, каб партыі, якія завуць сябе сацыялістычнымі, як ППС і інш., расстрэльвалі ўласнымі рукамі рабочыя дэманстрацыі. Гэтыя факты пралетарыят усяго сьвету запіша яскравымі літарамі на старонках сваёй гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы.

Кансалідацыя рэвалюцыйных рабочых мас выяўляецца ня толькі ў тым магутным уздыме рэвалюцыйнага руху пралетарыяту, які мы зараз наглядаем, а ў тым, што павялічваюцца шэрагі камуністычных арганізацый ва ўсіх краінах. Ужо няма амаль ніводнай дзяржавы, дзе-б ня было прафэсыянальных і камуністычных арганізацый. Водлуг апошніх вестак з прэсы мы даведваемся, што нават у такой краіне, як Урагвай, і там ужо маецца сэкцыя Камуністычнага Інтэрнацыяналу (воплескі).

Клясавая палітыка ў сельска-гаспадарчым падатку.

Асноўнымі палажэньнямі сельска-гаспадарчага падатку зьяўляюцца—**падаходнасьць і прагрэсыўнасьць.** Хто больш мае прыбыткаў, той больш павінен плаціць і падатку—вось першае правіла нашага падатковага абкладаньня. Гэтае правіла робіць падатак падаходным. Прагрэсыўнасьць яго-ж складаецца з таго, што ўласьнік большага прыбытку з кожнага свайго рубля выплачвае большую суму падатку, чымся ўласьнік меншага прыбытку. У гэтым другім правіле, уласна, і заключаецца клясавасьць сельска-гаспадарчага падатку—з заможных браць больш, з сераднякоў—менш, а беднату вызваляць поўнасьцю.

Зусім відавочна, што калі ня будзе вытрымана памянёная прагрэсыўнасьць, дык наша абкладаньне з пункту гледжаньня клясавасьці будзе няправільным. Часткова гэта і наглядалася ў мінулым годзе. Заможныя плацілі менш падатку, чымся трэба было, мяркуючы па іх прыбытках. Здарылася гэта таму, што ня ўсе іх прыбыткі мы ўлічвалі. Так, напр. прыбыткі ад спэцыяльных галін сельскае гаспадаркі, куды адносяцца гародніцтва, садоўніцтва і інш., улічваліся ўсяго толькі ў разьмеры 15 проц. ад іх сапраўднае велічыні, прыбыткі ад неземляробчых заработкаў—у разьмеры 9 проц. і г. д. Зразумела, што і абкладаліся яны таму няпоўна і нездавальняюча. Калі выправіць памянёную памылку, г. зн. больш поўна ўлічваць прыбытковасьць усіх сялянскіх гаспадарак, выкрыць усе ўтоеныя аб'екты абкладаньня, больш поўна ўлічваць няземляробчыя заработкі і спэцыяльныя галіны сельскае гаспадаркі, дык **прагрэсыўнасьць, а знача і клясавая лінія ў падатковай палітыцы будуць выпраўлены.**

У той-жа час гэта дае і некаторае павялічэньне падатку ў параўнаньні з мінулым годам. Зазначанае павялічэньне новым законам, ухваленым апошняй сэсіяй ЦВК'у, вызначаецца ў 25 проц., ці іншымі словамі падатак на 28-29 г. вызначаецца ў разьмеры 400 млн. р. (у мінулым годзе было 320 млн р.).

Павялічэньне падатку прыпадае на заможную частку вёскі. Гэта ахопіць, прыкладна, 38 проц. сялянскіх гаспадарак. У гэтую групу ўваходзяць усе кулацкія гаспадаркі і частка серадняцкіх. Большай часткі сераднякоў павышэньне падатку не закране, і нават для 12 проц. серадняцкіх гаспадарак, падатак будзе зьніжаны. Што-ж датычыцца беднаты, дык яна ўся таксама, як і ў мінулым годзе, вызваляецца ад падатку зусім. Усяго бяднякіх гаспадарак мы, такім чынам, вызваляем каля 8 з пал. млн., ці 35 проц. сялянскіх гаспадарак.

Дзеля большае прагрэсыўнасьці падатку новы закон устанаўляе два выключэньні пры абкладаньні заможных гаспадарак—**індывідуальны падыход і экспэртная ацэнка.** Першае складаецца з таго, што гаспадаркі, прыбытак якіх перавышае 400 руб., могуць быць абкладаемы з асобнымі процантнымі надбаўкамі да іх прыбытку. Надбаўкі гэтыя розныя—ад 5 да 25 проц.—і ўстанаўляюцца яны ў залежнасьці ад магутнасьці гаспадаркі. Пры шматсямейнасьці гаспадаркі закон прадугледжвае ня ўжываць процантных надбавак да гаспадарак з прыбыткам, не перавышаючым 50 руб. на едака. Прыбыткі гаспадарак скупшчыкаў, ліхвяроў, якія даюць пад вялікія процанты грошы ці прадукты, будуць абкладацца па асобных правілах, устанаўляемых НК Фінансаў, па падставе даных экспэртнае ацэнкі.

У мінулым годзе няземляробчыя заработкі абкладаліся ўсюды па-рознаму. На будучы 1928-29 г. яны будуць усюды абкладацца ў разьмеры ня менш 35 проц. Што-ж датычыцца заработнае платы па найму, дык яна будзе абкладацца ўсюды ў разьмеры 15 пр. у тым выпадку, калі работнік жыве на ўласнай гаспадарцы, і 10 проц. тады, калі ён ня жыве ў гаспадарцы. Да гэтых апошніх прыраўніваюцца і тыя, што працуюць на старане. Калі, напрыклад, гэткі рабочы (каменшчык, маляр і інш.) зарабіў 200 руб. дык абкладацца ў яго будуць толькі 20 р., што і складае 10 проц., рэшта—180 руб.—пад увагу ня будзе прымацца.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

КУЗЬНЯ СЬВЯДОМЫХ ГРАМАДЗЯН.

Магілеў. У мэтах барацьбы з бясспрытульнасьцю ЦК Дапамогі Дзецям у мінулым годзе адчыніў у Магілеве Цэнтральную Ўсебеларускую Дзіцячую Камуну на 200 асоб.

Пры камуне маецца вялікая і даволі ўзорна пастаўленая сельская гаспадарка, з галінамі: жывёлаводзтва, садоўніцтва, гародніцтва і хмеляводзтва. Былі адчынены майстэрні: сьлясарна-кавальская, шавецкая, кравецкая і сталярная і 7-хгадовая школа. З гэтага боку камуна была забясьпечана даволі добра. Адным словам былі прадстаўлены вельмі спрыяючыя ўмовы для жыцьця, працы і разьвіцьця дзяцей.

Камуна мае вялікія дасягненьні ўжо к гэтаму часу—праз якіх-небудзь 6 месяцаў працы. Гэта ня прытулак дзяцей, як думалі некаторыя, для кармёжкі, а самаарганізацыя дзяцей, стаўшая на працягу кароткага часу на шлях добрага выхаваньня. Хто бачыў пастаноўку працы ў камуне, яе зьмест, плянавасьць і г. д., каму вядома пастаноўка сельскай гаспадаркі, праца ў майстэрнях і школе,—таму, бязумоўна, зразумелы тыя дасягненьні, якія мае камуна за паўгода свайго існаваньня. Справа была-б яшчэ лепш, каб адбывалася адпаведнае ўкамплектаваньне камуны дзяцьмі, укамплектаваньне такое, якое-б падыходзіла да яе мэтаў, а не выпадковае.

З 1-га мая камуна дзяцей перайшла на рэйкі практычнай сельска-гаспадарчай працы, замест навучаньня грамаце і рамяству на працягу зімы.

Можна спадзявацца, што камуна за вясну і лета таксама не падкачае, як за зіму.

Юнкораўскі гурток камуны.

Пад суд за нядбайныя адносіны да самаабкладаньня.

Бярэзіна. Па Бярэзінскаму райёну праведзена самаабкладаньне грашыма на суму 14300 р. 6 кап. і працай на суму 300 р.; узыскана да гэтага часу 4237 р. 37 кап., што складае 22,17 проц.

За нядбайныя адносіны да самаабкладаньня Райвыканком аддаў пад суд тры сельсаветы: Бярэзінскі сельскі, Неганіцкі і Дзьмітравіцкі. Аддадзен таксама пад суд грамадзянін вёскі Койцын, Брадзецкага сельсавету (кулак) які вёў агітацыю сярод насельніцтва супроць самаабкладаньня.

На ўзысканыя грошы па самаабкладаньню райвыканком адчыняе 2 фельчарскіх пункты ў Машчаніцкім с.-с. і Пагоскім і адзін вэтпункт у Багушэвіцкім с.-с., рэшта грошай пойдзе на дарожнае і школьнае будаўніцтва.

П. Б.

Без агранома ня выб'емся на культурны шлях.

У вёсках: Маляўшчына, Ляхі, Гараны, Траскоўшчына Заслаўская райёну, Менскай акругі з боку сялян назіраецца вялікае імкненьне да культурнага калектыўнага вядзеньня сельскае гаспадаркі. Але нажаль туды не пасылаюць агравома і сяляне скардзяцца на гэта і кажуць, што на іх просьбы аб прысылцы агранома райвыканком маўчыць. Трэба райвыканкому як найхутчэй зьвярнуць увагу на просьбу сялян і камандыраваць у гэтыя вёскі агранома, каб апошні сваім растлумачэньнем і практычным паказам памог сялянам ажыцьцявіць іх імкненьня да культурнай калектыўнай сельскай гаспадаркі.

Масальскі.

СРОДКІ НА ЎПАРАДКАВАНЬНЕ МЯСТЭЧАК.

Мазыр, 16-У. На ўпарадкаваньне мястэчак нашай акругі адпушчана 20800 руб. доўгатэрміновага крэдыту.

5000 Р. НА РАМОНТ С.-ГАСП. ІНВЭНТАРУ.

Віцебск, 16-У. Сёньня атрымана з Менску 5000 р. даўгатэрміновага крэдыту. Сродкі гэтыя адпушчаны спэцыяльна на абсталяваньне майстэрні па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

ГАРАДЗКІ ДАБРАБЫТ.

Гомель. Распачата праца па ўпарадкаваньню гораду. Са сродкаў мясцовага бюджэту на ўпарадкаваньне асыгнавана 84.776 руб. і ў парадку грамадзкіх работ на ўпарадкаўчыя мерапрыёмствы будзе патрачана 113984 руб. Робіцца плянаваньне вуліц, асушка нізін, капаюцца канавы, па акраінах гораду пасаджана 1000 дрэваў, брукуюць вуліцы і г. д. Для правядзеньня ўпарадкаваньня гораду ўласьнікі дамоў прымаюць удзел у водпуску сродкаў.

Барацьба з жыльлёвым крызісам.

Гомель. За апошнія 4 гады ў Гомелі маецца некаторы прырост жыльплошчы. Аднак, гэты рост не дае паслабленьня кватэрнага крызісу. У той час, як насельніцтва Гомелю ўзрасло з 78 тысяч у 1924 г. да 89 тысяч у канцы года, прырост жыльплошчы за гэты-ж пэрыяд дае 104.529 кв. арш. Такім чынам, Гомель адстае ад сярэдняй нормы БССР у 12 кв. арш.

Для здаволеньня насельніцтва Гомелю і Новабеліцы неабходна пабудаваць 574.336 кв. арш. Сёлета будуць скончаны будуемыя Жылкаапсаюзам 2 мураваныя дамы на 2932 кв. метры, 2 мураваных дамы на 3600 і 4 драўляных дамы на 2157 кв. мэтры. Прыватнымі асобамі будзе пабудавана каля 50 дамоў з агульнай плошчаю да 5000 кв. мэтраў. У 54 дамох будзе зроблен капітальны рамонт.

ЛЕПШЫЯ СПАЖЫВЕЦКІЯ Т-ВЫ.

ГОМЕЛЬ, 16-У. Па акрузе праведзен конкурс на лепшае спажывецкае т-ва па збору паявых уносаў.

Першую прэмію за пасьпяховы збор паёў атрымала Гліна-Слабодзкае т-ва, у якім сярэдні пай на 1-га красавіка быў 9 р. 12 к. Другую прэмію атрымала Узьбінскае т-ва за сярэдні пай у 8 р. 89 к. Трэцюю прэмію—Васільеўскае т-ва за сярэдні пай у 8 р. 41 к.

АСУШВАЕМ БАЛОТЫ.

БАРЫСАЎ, 16-V. Гэтымі днямі распачынаецца праца па рэгуляваньню р. р. Гайны і Бродні ў Барысаўскім раёне. Мяркуецца працу па рэгуляваньню правесьці на працягу 3,7 кілёмэтраў, на што асыгнавана 25.000 руб.

ПАБУДОВА ШАШЫ МАГІЛЕЎ—МЕНСК.

Магілеў, 16-5. Пабудова шашы Магілеў—Менск разгарнулася поўным ходам. Зараз ідзе праца па пракладцы шашы на працягу 100 кіл. ад г. Магілева да м-ка Бярэзіна. На гэтай працы занята да 3.500 рабочых.

ПАБУДОВА ЛЯЧЭБНІЦЫ ДЛЯ РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ «ДВИНА».

Віцебск, 16-5. У бягучым будаўнічым сэзоне пры ільна-прадзільнай фабрыцы «Двина» пачнецца пабудова лячэбніцы.

Нар. Кам. Аховы Здароўя адпусьціў на пабудову гэтай лячэбніцы 25.000 р.

ПОП І ЧЫРВОНЕЦ.

Бацюшка Лазар Чыстабаеў з в. Капусьціна (Бабруйскі р.) часта разважаў аб сваім жыцьці - быцьці:

— Усё-ж як не гавары, мая мілая, казаў ён да пападзьдзі,—раней было лепш жыць. Ды чаму было і ня жыць: плацілі грошы, у воласьць пойдзеш, там усе шапку здымаюць, ідзеш па вуліцы—усе кланяюцца, цалуюць у рукі.

А цяпер... Цяпер няма ніякай пашаны, людзі пачалі ня верыць у бога. Не, было-б добра і цяпер, каб ніхто не чапаў бога, няхай-бы ўсё было ціха. Дык не,—пашлі супроць бога. А ўсё гэта хто—камсамольцы, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы ды іншыя бязбожнікі. І што ім трэба. Ня ведаю.

— Возьмем, напрыклад, Яўдакіма Сіўчыкава. Ён-жа ў мяне быў на першым месцы, а вось пабыў у Чырвонай арміі, навучылі яго там і ён зусім перастаў верыць у бога. Ну, ты-ж бы ня верыў, ды хоць маўчаў. І куды гэта варта: ходзіць па клюбах, хатахчытальнях і гаворыць там пра бога, усю моладзь ад царквы адбіў, хлеб хоча адбіць. Пачакай, памрэш—не пайду адпраўляць, нават і разу ня кіўну кадзілам.

* * *

Дэмабілізаваны чырвонаармеец Сіўчыкаў Яўдакім ведаў, што на яго злуецца поп, але ён на гэта не зьвяртаў ніякай увагі і выконваў свой грамадзкі абавязак: праводзіў гутаркі на антырэлігійныя тэмы сярод сялянства.

Сіўчыкаў вярнуўся з Чырвонай арміі ўвосень 1927 г. Сёлета зімой ён захвараў і нядаўна памёр.

Поп, даведаўшыся аб сьмерці Сіўчыкава, не находзіў месца ад радасьці, ён з добрым апэтытам у гэты дзень пасьнедаў, выпіў чарку за «здароўе» нябожчыка.

Тады, як поп радаваўся, радня Яўдакіма плакалі і ўсё гаманілі аб тым, хто-ж будзе адпраўляць.

— Кіньце вы галасіць, сказаў бацька Яўдакімаў. Я зараз пайду да бацюшкі Лазара, папрашу яго добра і ён адправіць. А на ўсякі выпадак, каб не ламаўся бацюшка, вазьму з сабой чырвонец.

Пайду.

І пашоў. Прышоў і пачаў прасіць бацюшку:

— Бацюшка, будзьце ласкавы, пахавайце майго сына.

— Твайго сына?

— Майго, майго, бацюшка,—хутка скаваў селянін, спадзяючыся на ласку папа.

— Па тваім сыне я адпраўляць ня буду. Ён бязбожнік, ідзе супроць бога. Яму бог не патрэбен,—так бубнеў поп, ходзячы па пакоі.

„Нічога ня будзе“ падумаў селянін, трэба даць чырвонец. І ціха, няпрыметна усунуў руку ў кішэню.

Поп гэта «зьмікіціў» і хітра сказаў:

— Да-а-с-с. Памёр твой сын. Шкода, трэба ўсё-ткі падумаць адпраўляць па ім ці не.

Сказаўшы гэта, бацюшка пачаў весела хадзіць з кутка ў кут свайго пакою.

— Бацюшка, будзьце-ж ласкавы. Вось вам за „труд“ чырвончык.

Бацюшка, узяўшы ў жменю бараду, засьмяяўся і ласкава працягнуў руку да беленькае паперкі, пасьля чаго сказаў:

— Ведаеце што, мне неяк «неудобно» пасьля такога становішча ды хаваць вашага сыка. У нас з ім былі нелады. Вы яго пахавайце самі, а я па ім памалюся...

— Добра, бацюшка, абы з богам.

І так хавалі Яўдакіма без папа.

А чырвонец... што чырвонец. Ён хутка пашоў рабіць рэвізію аддзяленьня цэнтрасьпірту, і поп саракаградуснай вадзіцай усю ноч «сьвяціў» магілу нябожчыка Яўдакіма.

Я. Збуржынскі.

Эксплёатацыя інвалідаў.

У м. Капылі ёсьць інвалідна-кааперацыйная арцель каўбаснае вытворчасьці «Чырвоны Баявік». Арцель існуе з 1926 г. і залічана сябром БСІКА (Бел. Саюзу інвалідн. кааперацыі) і яднае 7 інвалідаў вайны. Інваліды атрымліваюць за сваю працу хоць мізэрны заработак, але жыць можна. Інваліды пачалі адчуваць сябе, што і яны людзі не непатрэбныя, што і яны маюць права зарабіць хлеб самі сабе.

Пастановаю Эканамічнае Нарады БССР у канцы 1927 г. забаронена весьці самастойную загатоўку сыравіны для інвалідзкае каўбаснае арцелі. Інвалідная арцель заключыла ўмову на дастаўку сыравіны з Капыльскім сельска-гаспадарчым таварыствам. Гэта ўмова закабаліла інвалідную арцель. Сельска - гаспадарчае т-ва, хочучы выжыць з мясцовага рынку арцель, згадзілася толькі на гэткія ўмовы: інваліды па пасьведчаньнях с.-г. т-ва загатаўляюць самі для сваёй вытворчасьці сьвіней. Гэта значыць, ні за што ні пра што інваліды плацяць с.-г. т-ву 2,4 проц. камісыйных. Інваліды-ж, ня маючы другога выхаду, загатаўляюць самі сьвіней і плацяць сельска-гаспадарчаму таварыству за „яго фірму“ грошы. Ад гэткай эксплёатацыі інвалідзкае працы інвалідная арцель была прымушана зьліквідаваць сваю дзейнасьць.

Капыль, Меншчына.

Крывы.

Радыё ў чвараку.

У Беларусі атрымлівалі зямлю князі, бароны, адстаўныя царскія генэралы, звычайныя паны.

Цісьнулі беларуса. Ня меў ён выхаду далей, як на свой вузенькі шнур.

Праца—панскі маёнтак; узнагарода за працу—„ласка“ панская; культура—цёмны, замкнёны чварак.

Цяпер батракі прагналі паноў. Зямля, аблітая потам і крывёй беларускага батрака, зрабілася яго ўласнасьцю.

Беларускі безьзямельны батрак больш ня гне сьпіну перад графам ці баронам. Больш ня сьвішча панскі бізун пазашыйку ў якасьці платы за катаржную працу. Батрак больш не сядзіць у цёмным, сырым чвараку.

Есьць батрацкі прафэсыянальны саюз, які арганізуе батракоў.

Праца—8 гадзін.

Зарплата—па калектыўным дагаворы.

У вольны час—культасьветная праца.

Беларускія батракі і лясныя рабочыя маюць 113 радыё-ўстановак. На арганізацыю радыё ў савец

Жыцьцё і праца асьветніка.

Дырэктывы нявыкананы.

Вынікі конкурсу на лепшы мясцком і групком па распаўсюджваньню газэты «Савецкая Беларусь» сярод асьветнікаў ужо апублікаваны. Гэтыя вынікі аказаліся далёка нездавальняючымі, калі ня лічыць некаторым посьпехам распаўсюджваньне газэты па Менскай акрузе.

У чым справа? Чаму па Менскай акрузе маюцца хоць некаторыя посьпехі, а па іншых акругах амэль ніякіх? Зразумела, што справа ня ў якасьці газэты, ня ў тым, што яна недастаткова высьвятляе жыцьцё і працу асьветніка, а справа ў тым, што прафорганы ня выканалі дырэктывы ЦП саюзу Белпрацасьветы, не стварылі належнай грамадзкасьці навакол пытаньня распаўсюджваньня газэты, не ўцягнулі масы дапішчыкаў у старонку асьветніка, не ўдзялілі належнай увагі справе пастаноўкі тэхнікі ў час самай падпіскі, не зьвярнулі ўвагі на тое, што асьветнік, які закінут у далёкі куток Беларусі, можа і хацеў-бы падпісацца на газэту, але па тэхнічных умовах гэтага зрабіць ня можа. Вось у чым галоўная прычына слабых вынікаў конкурсу.

Мы па БССР маем у сучасны момант каля 24 тысяч сяброў саюзу працасьветы. Калі-б з іх падпісалася на газэту палова, нават трэцяя частка, то і гэта дало-б досыць значную лічбу, між тым мы вельмі далёка ад гэтай лічбы. Па тых вестках, якія маюцца ў ЦП саюзу Белпрацасьветы, досыць значная частка асьветнікаў зусім ня выпісвае беларускіх газэт. Гэта зьявішча сымптаматычнае, яно сьведчыць аб тым, што ў нас яшчэ вельмі шмат фармалізму ў справе беларусізацыі, у справе разуменьня нацпалітыкі. Сапраўды, як можна абыйсьціся настаўніку, хатніку, дашкольніцы, выхавацелю дзіцячага дому без беларускага друкаванага слова. Мы ведаем, што беларускіх часопісаў у нас асьветнікі выпісваюць вельмі мала, бо гэта іншаму і не на кішэні, але газэту кожны культурны чалавек павінен чытаць, тым больш асьветнік, які і сваю непасрэдную працу вядзе на беларускай мове.

Газэта «Савецкая Беларусь» павінна стаць аднэй з самых масавых, самых папулярных газэт сярод асьветнікаў. Яна больш чым нават магчыма па сваіх разьмерах адводзіць месца культ.-асьветным пытаньням на сваіх старонках, яна бяз спэцыяльных сродкаў зрабіла крок да выданьня асьветніцкага дадатку, яна на працягу больш, чым двух гадоў адводзіць спэцыяльнае месца па сваіх старонках для высьвятленьня жыцьця і працы асьветніка. Вось чаму паўстала пытаньне аб распаўсюджаньні газэты сярод асьветніцкіх мас, вось чаму і ЦП саюзу лічыць неабходным правесьці кампанію за пашырэньне падпіскі на газэту «Савецкая Беларусь».

Толькі пры ўмове пашырэньня падпіскі, уцягненьня дапішчыкаў у газэту, магчыма будзе палепшыць выданьне старонкі асьветніка, якая зьяўляецца пачаткам выданьня друкаванага белэрускага асьветніцкага органу.

Яз. Мацюкевіч.

Як скарыстаць школьную зямлю?

Сяляне самі добра зразумелі важнасьць школьнага будаўніцтва, і бясспрэчна аддаюць кавалкі зямлі, лепшай якасьці, пад школы. Дзе земляўпарадкоўваліся вёскі, там кожная школа атрымала сабе зямлю.

У сучасны момант перад намі паўстала пытаньне, як гэту зямлю скарыстаць?

Калі скарыстоўваць зямельные вучасткі самім, дык патрабуецца патраціць шмат часу і энэргіі. У такім выпадку ўсё віраўніцтва ляжыць на плячох настаўнікаў, тады як ён хутчэй ірвецца атрымаць сабе адпачынак.

А мо' мы школьныя вучасткі здадзім у арэнду?

Вядома рэч, па гэтаму пытаньню павінны выказацца самі настаўнікі і яно не застанецца ня высьветленым. Але-ж у сваёй працы настаўніцтва павінна прытрымлівацца самастойнасьці і не забываць, што савецкая школа апроч іншага носіць назву—савецкай трудавой школы. Ініцыятыва пытаньня як скарыстаць школьнаю зямлю, павінна знаходзіцца ў нашых руках—у руках настаўнікаў. Калі зрабіць паказальны агарод, расшнураваць паказальныя градкі, адкуль селянін будзе пераносіць вопыты на сваю зямлю—будзе больш карысьці, чым арэнда.

Мала гэтага: школам трэба яшчэ увекавечыць памяць Кастрычніка. І гэта нам ня цяжка зрабіць, калі адвесьці вучастак зямлі пад фруктовы сад. І толькі астачу зямлі, якую не магчыма самім упарадкаваць, можна здаваць у арэнду.

На гэта пытаньне павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу асьветныя ўстановы і выказацца ў разрэзе закранутага пытаньня.

Лішанкоў.

Экскурсіі з вучнямі—лепшы сродак навучаньня.

Кожны савецкі настаўнік, нават кожны савецкі грамадзянін, добра ведаюць каштоўнасьць і месца экскурсіі ў школьнай працы.

Экскурсіі патрэбны і неабходны ня толькі пры навучаньні прыродазнаўству, якое лічыцца краеугольным каменем нашага матэрыялістычнага навучаньня, але і ўсіх іншых дысцыплін, якія павінны мець увязку з прыродазнаўствам. На падставе гэтага экскурсіі сталі аднолькава каштоўнымі як школьнікам першага, так і другога канцэнтру, пры гэтым трэба зазначыць, што каштоўнасьць іх мае месца на працягу ўсяго навучальнага году ў розных тэрміны яго.

Справа ў тым, што ня толькі нашы школьнікі, а часта і дарослыя людзі, іншы раз добра адукаваныя, ня могуць распазнаваць ні толькі расьлін, якія сустракаюцца на нашай глебе, або казявак, а часта блытаюць назву дрэва, нават часамі ня ведаюць назвы жывёлы і г. д.

Маючы на ўвазе вышэйпаданае, пэдсаветам належыць зьвярнуць асаблівую ўвагу на вясенныя экскурсіі. Трэба пільна сачыць за тым, каб яны не зьяўляліся пустым марнаваньнем часу, як гэта бывала, а каб яны замянілі сабою заняткі ў душным, часта антысанітарным школьным памяшканьні, будучы перанесенымі на лёна прыроды, у самую гушчу яе.

Лепшым выяўленьнем атрыманага за тэй ці іншай экскурсіі будуць зарысоўкі, мантыроўка калекцый або паасобных аб'ектаў з усяго сабранага і абгледжанага ў часе экскурсіі матар'ялу. Гэта будзе і паказальна і лепшы сродак да замацаваньня ў мазгох таго, што зьяўлялася аб'ектам знаёмства і вывучаньня, а таксама і штурхчом дзеля дзяцей і настаўніка на далейшую працу.

Практычна падыйсьці да разьвязаньня гэтага пытаньня, па мойму, можна наступным парадкам, маючы на мэце такі плян:

Экскурсіі з дзецьмі ў лес або сад дзеля распазнаваньня дрэва і практычная прапрацоўка гэтае экскурсіі на месцы.

Экскурсіі дзеля назіраньня нац жыцьцём дрэва (распусканьне лісьцяў, сок) і на дрэве (птушкі, казяўкі), а таксама знаёмства з некаторымі біялёгічнымі момантамі, зьвязанымі з гэтым.

Лябараторная праца па вывучэньню почкі.

Экскурсіі на дзеравааапрацоўчы завод (што з якога дрэва вырабляецца і чаму).

Тут абавязкова патрэбна весьці дзеньнік і рабіць належныя запісы і вывады, на падставе якіх неабходны падагульняючыя пісьмовыя працы.

Мантыроўка калекцый, як заключны момант працы, якую можна будзе скарыстаць на працягу навучальнага году.

І. Масюкевіч.

Настаўнік з жыцьцём.

Што масавае настаўніцтва прымае шчыры ўдзел у грамадзкім жыцьці і нярэдка праўляе сабе ў ролі арганізатараў і ініцыятараў разумных пачынаньняў,—гаварылася і пісалася многа раз. Факты самі за сябе гавораць, хоць яны і ня фіксуюцца.

Тут я адзначу адзін момант, зусім ня выдатны, удзелу настаўніцтва Сьмілавіцкага раёну ў ажыцьцяўленьні задач грамадзкага і дзяржаўнага значэньня, гэта: самаабкладаньне, сялянская пазыка і вясновая пасяўная кампанія. Яшчэ аб іх гаварылі толькі на паперы, а настаўнік вясковы ўжо думаў аб тэй ролі, якую яму трэба будзе ў гэтых справах заняць. Каб ня было анархізму і саматужніцтва ў працы настаўніцтва, РМК працасьветы зьвярнуўся з лістом да кожнага настаўніка і вызначаў агульныя вехі ў гэтай працы.

На нарадзе прафдэлегатаў раёну 20-IV побач з праізводчымі пытаньнямі стаялі і пытаньні грамадзкага характару: рэалізацыя сялянскай пазыкі, самаабкладаньне і пасяўная кампанія. На кожнаму пытаньню настаўніцтва дзелавіта выказвалася і раіла найлепшыя мэтады ўжываньня пры правядзеньні тэй ці іншай кампаніі. Па сялянскай пазыцы было адзначана, што разьясьніцельная кампанія ўжо досыць. Зьбіраць сходы і тлумачыць аб пазыцы ўжо ня варта. Найлепей на вёсцы стзарыць актыў моладзі, цераз які распаўсюджваць аблігацыі сярод насельніцтва. Гэты спосаб даў найлепшыя вынікі. Трэба лічыцца з псыхалёгіяй нашага селяніна, які не заўсёды хоча, каб ведаў яго сусед, што ён робіць з сваёю капейкай.

Па самаабкладаньню зусім мала было разьясьненьня насельніцтву. Вельмі часта можна пачуць галасы на сходзе: «а на што гэта самаабкладаньне»? «а куды вы яго дзенеце?» і г. д.

Пасяўная кампанія і падрыхтоўка да яе выражаецца, галоўным чынам, у ачыстцы насеньня. Гэта работа стала досыць папулярнай, і агітаваць за яе непатрэбна. Таксама і выгады шматпольля і травасеяньня для большасьці насельніцтва вядомы. Што датычыць калектыўных форм гаспадаркі, то тут справа не ў зразуменьні, а ў адсутнасьці пункту прыкладу сіл.

Машынная апрацоўка, разумны распарадак у землякарыстаньні, лепшая жывёла—вось аргумэнты настаўніка ў агітацыі за лепшыя формы землякарыстаньня. Гэтая справа, досыць вялікая, патрабуе ломкі ва ўсім укладзе сялянскага жыцьця. Але перад гэтымі адпаведнымі задачамі настаўніцтва выкажа досыць упэўненасьці і дапаможа пабудаваць лепшае нашаму сялянству жыцьцё.

Ш.

Што скажа Нар. Кам. Асьветы?

(Менскі Белпэдтэхнікум).

Мэтавая ўстаноўка пэдагагічных тэхнікумаў вымагае, каб маладое настаўніцтва, якое выходзіць са сьцен навучальных устаноў, было ўнівэрсальным па ўсіх «вялікіх дробязях» новага вясковага жыцьця, каб настаўнік здолеў быць парадчыкам селяніну ў вядзеньні больш культурнай гаспадаркі. Студэнты таксама не павінны пазбаўляцца с-г. ведаў, бо большасьць іх павінна працаваць на сельскай гаспадарцы. Для гэтай мэты і ўведзены с-г. практыкум у Менскім Белпэдтэхнікуме.

Але вось тут і прыходзіцца сказаць „стоп". Дрэнныя матар'яльныя ўмовы, у якіх знаходзіцца студэнцтва на с г. практыкуме, прымушае задумацца над тым, ці зможа даць добрую карысьць гэты практыкум. Студэнтам прыдзецца рабіць вялікія пропускі заняткаў, а некаторым і зусім кідаць практыкум для таго, каб як-небудзь здабыць сродкі на пражыцьцё. Праўда, дырэктар тэхнікуму часта заяўляе, што студэнты павінны адбываць практыкум у такіх умовах, у якіх вучыліся і зімою. Супроць гэтага можна выставіць наступны аргумент: большасьць незабясьпечанага студэнцтва нашага тэхнікуму знаходзіла сабе зімою працу на лікпунктах некаторыя ходзілі на чорную работу і г. д. Наркамасьветы на 39 чал. практыкантаў адпусьціў толькі 490 руб., чаго вельмі мала, каб забясьпечыць практыкантаў.

Атрымоўваецца тое, што студэнты забясьпечаны кармёжкай. Практычная-ж праца студэнта прымусіць яго парваць апошнюю адзёжу, а набыць яе ня будзе за што. Так што перад студэнтамі наступны год усьміхаецца надта горка, горай, як на першым курсе, бо тады дапамагаў бацька, а цяпер ён адмаўляецца дапамагаць, бо студэнт не памагаў яму ў гаспадарцы, што ён рабіў у папярэдніх вакацыі. А большасьць у тэхнікуме—з сялян-беднякоў. Нават ёсьць некаторыя такія з нестыпэндыянтаў, бацькі якіх плацяць 3-4 руб. падатку. Значыць, бацька хоць-бы і хацеў дапамагчы, дык ня можа. І яшчэ: час знаходжаньня на фарме пазбаўляе нас усякай мажлівасьці здабыць грошы на мыла, мыцьцё бялізны і інш. А нам даюць абед і больш нічога. Якая-ж можа быць прадуктыўнасьць ад практыкуму? Як ён можа ўбіцца ў галаву, калі студэнт будзе думаць аб хлебе?

Наркамасьветы неабходна зьвярнуць на гэта ўвагу.

Па даручэньні студэнтаў-практыкантаў: Я. ТУРАВЕЦ, П. ШАДУРСКІ, Я. БУДЗЬКА, Ф. СЯМАК, З. ГЕРАСІМОВІЧ.

Новы рэдактар школьнага статуту.

(Да ўвагі Наркамасьветы).

Наш інспэктар вялікі жартаўнік. Жартуе ён заўсёды. Апошні час ён пачаў жартаваць са статутам адзінай працоўнай школы. Перш-наперш не спадабаўся яму артыкул 49 статуту, дзе сказана, што мерамі выхаваўчага ўплыву зьяўляюцца ўгаворы, выгавары, умоўныя выключэньні і інш. «Якая-ж гэта мера выхаваўчага ўплыву ўмоўныя выключэньні, калі сучасная пэдагагічная літаратура лічыць іх караю»?—думае наш інспэктар. «Трэба ў гэты пункт унесьці папраўку». Надумаўся—і зрабіў. Па ўсіх школах паляцелі паперкі, у якіх інспэктар забараніў ужываць у практыцы школ умоўныя выключэньні, як не адпавядаючыя сучаснай пэдагагічнай думцы. Зьдзівіліся гэтаму асьветнікі і пачалі пытаць інспэктара: «што значыць гэты сон?» А інспэктар у адказ: „Статут устарэў, трэба ў яго ўнесьці зьмены". Унёс інспэктар і другую папраўку. Зусім не спадабаўся яму артыкул 38 статуту: „пастановы школьнае рады праводзяцца ў жыцьцё безадкладна пасьля іх вынясеньня". Што гэта за артыкул? Які інспэктар, які мае хоць кроплю гонару, можа пагадзіцца з ім? А наш інспэктар мае гонару вельмі многа і яму зусім гэты артыкул не да спадобы. І ён сваёю паперкаю зусім адмяняе яго. Яшчэ больш зьдзівіліся асьветнікі, вычытаўшы, што без зацьверджаньня інспэктара нельга праводзіць пастановы школьнае рады ў жыцьцё. Ніяк ня могуць дадумацца, каму трэба цяпер верыць: ці статуту, ці інспэктару. «А можа і Наркамасьветы ўжо адмяніў гэтыя артыкулы, дык чаму ён не паведамляе аб гэтым школы?" мільгае ў кожнага думка.

Наркамасьветы, адгукніся! Асьветнікі Слуцку чакаюць твайго слова. Хутчэй паведамі—ці мае інспэктар права адмяняць статут, ці не.

Настаўнік.

Слуцак.

Украінскія песьняры ў Менску.

Супольнымі шляхамі.

(Літаратурны вечар у клюбе Карла Маркса).

Агульная мінуўшчына і агульная сучаснасьць.

Гісторыя Беларусі і Украіны з даўных-давён ідзе аднымі шляхамі: агульная мінуўшчына і супольная сучаснасьць.

У мінуўшчыне—шматвяковыя цярпеньні працоўных Беларусі і Украіны ў капцюрох белага арла, ксёндзкі і паняверка; у далейшым—на зьмену гэтай нядолі прыходзіць новая: розгі, шпіцрутэны і турмы расейскіх Мікалаеў-палачнікаў і Мікалаеў-крывавых. Самабытасьць і своеасабістасьць жыхароў Беларусі і Украіны была доўгія вякі задушана гэтымі «апякунамі».

Агульная нядоля, агульнае імкненьне і агульнае змаганьне...

Вось чаму пясьняр-змаганьнік працоўнай Украіны Тарас Шэўчэнка адноўкава мілы і родны Украіне і Беларусі. Украінскага бандурыста разумеў беларускі лірнік, а нашага лірніка разумеў украінскі бандурыст: і той і другі апявалі злыбеду працоўных мас пад уціскам буржуазеі, будзячы нацыянальную сьвядомасьць і волю да барацьбы з ворагамі працы.

Краіна вялікіх стэпаў-прастораў, сагрэтых гарачым паўднёвым сонцам,—

Украінскі паэта ПАЛІШЧУК чытае свой пераклад паэмы М. ЧАРОТА «БОСЫЯ НА ВОГНІШЧЫ».

Украіна,—раней загула бунтам-вольніцай. Яна першая кінула покліч—на барацьбу з польскай шляхтай і ксяндзамі-езуітамі, даючы прыклад жыхару хмурых лясоў і балот беларускіх.

Адбыўся вялікі гістарычны пералом. Прышоў збавіцель-Кастрычнік, які вызваліў з турмы ў ліку іншых і беларусаў і украінцаў, адчыніў новыя сьветлыя шляхі. І зараз—супольнае шчасьце і радасьць былых нявольнікаў—беларусаў і украінцаў.

Загнаная раней у падпольле беларуская і украінская культура, у прыватнасьці літаратура, набывае ўсе правы грамадзянства. Яна адразу „зарунела, зарунела аксамітам". Шырокія шэрагі пісьменьнікаў і паэтаў і на Беларусі і на Украіне выйшлі на новы вольны шлях, каб будаваць новую культуру і літаратуру, нацыянальную па форме, пралетарскую па зьместу.

У гэтай супольнай радасьці перамогі найшчырэйшае вітаньне прадстаўнікоў украінскай культуры—пісьменьнікаў і паэтаў Украіны,—выканае сёньня беларускай грамадзкасьцю, натуральнае і зусім зразумелае.

Мы вас разумеем, а вы нас.

На эстраду адзін за адным выходзяць украінскія госьці—песьняры: дэклямуюць пераклады твораў беларускіх песьняроў і свае ўласныя.



УКРАІНСКІЯ ПІСЬМЕНЬНІКІ Ў ПРЭЗЫДЫУМЕ.

Бурлівай крыніцай цячэ мілагучная украінская мова, песьціць вуха.

Маладняковец—юнак **Паўло Усэнка**—дэклямуе ў перакладзе на сваю мову верш Дудара «Зацьвіла зара малінаю». Малады імпэт маладнякоўскіх бадзёрых слоў перадаецца аўдыторыі. Гучныя воплескі нясуцца ў награду юнаку.

Андрэй Панаў падае аўдыторыі па-украінску ўрывак з „Безназоўнага" Янкі Купалы, **Уладзімір Сасюра**—пераклад вершу нашага Александровіча; **Панч**—абразок-аповесьць з эпохі грамадзянскае вайны; **Аркадзь Любчэнка**—чытае сваю мастацкую навэлю; **Валяр'ян Палішчук**—гучным голасам чытае ўрывак з няўмыручай паэмы Чарота «Босыя на вогнішчы»; украінскае «уру-ру» і „трата-та", уведзеныя паэтай у урывак, яшчэ магутней выяўляюць гром рэвалюцыі, апеты ў паэме. **Іван Кулік** даў малюнак зьдзеку „дэмакратычных" янкі над чарнакожымі і кітайцамі, а яго „Джазбанд" быў сапраўным джазбандам. **Паўло Тычына** высыпаў пэрлы ўласных твораў, а **Сяргей Піліпенка**—байкар—паказаў на украінскай мове нашага Крапіву і ўласныя байкі-алегорыі.

Г. Казячы.

АДНО З ДАСЯГНЕНЬНЯЎ УКРАІНСКАЙ КУЛЬТУРЫ.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам украінскі пісьменьнік—намесьнік Старшыні Украінскага Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Тараса Шэўчэнкі тав. **Піліпенка** ў кароткіх рысах абмаляваў задачы, якія паставіў перад сабой Інстытут, і яго працу.

Гэты Навукова-Дасьледчы Інстытут—установа яшчэ вельмі маладая: ён арганізаваўся толькі ў 1927 годзе. Інстытут паставіў сваёй задачай весьці дасьледваньне на марксыцкай падставе гісторыі украінскай літаратуры як мінулай, так і сучаснай.

Згодна пастаўленых задач, Навукова-Дасьледчы Інстытут падзелен на пяць габінэтаў: першы габінэт—дашэўчэнкаўская літаратура, канчаючы першай паловай 19 стагодзьдзя, другі габінэт—біаграфія Тараса Шэўчэнкі: трэці—бібліяграфічны габінэт; чацьверты—пэрыяд пасьля Шэўчэнкі—другая палова 19 стагодзьдзя да гадоў рэвалюцыі; пяты габінэт займаецца вывучэньнем сучаснай рэвалюцыйнай літаратуры.

На чале Навукова-Дасьледчага Інстытуту стаіць вядомы акадэмік Багалей.

Галоўная праца Украінскага Навукова-Дасьледчага Інстытуту, як відаць з назвы, якую ён носіць, канцэнтруецца вакол фігуры вядомага кабзара Тараса Шэўчэнкі. Навукова-Дасьледчы Інстытут выдае штогоднік, у якім высьвятляецца праца Інстытуту. Апрача штогодніка, Інстытут выдаў сэрыю навукова-папулярных кніг—твораў Тараса Шэўчэнкі. Гэтыя кнігі выдадзены на падставе дакладных тэкстаў, якімі зьяўляюцца фатаграфічныя здымкі ўсіх рукапісаў Тараса Шэўчэнкі.

У ЭКАНОМНАРАДЗЕ ПРЫ СНК БССР.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ МАЛОЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным арганізаваць у 4-х акругах: Менскай, Віцебскай, Гомельскай і Магілеўскай малочную каапэрацыю з тым, каб яна была ўтворана да наступнага бюджэтнага году. Малочная каапэрацыя будзе васьці апэрацыі па збыту малака і малочных прадуктаў, птушак і яек, а таксама дастаўляць малочны інвэнтар, канцэнтраваныя кармы, племянную і карыстальную жывёлу.

Эканамічная Нарада пастанавіла да пачатку работы малочнай каапэрацыі вызначыць 125 тыс. руб., лічачы па 25 тысяч руб. як на акруговыя саюзы, так і на ўсебеларускі.

ПЛЯН АБАВЯЗКОВАГА СЕЛЬСКАГА АКЛАДНОГА СТРАХАВАНЬНЯ НА 1928-29 г.

Эканамічная Нарада зацьвердзіла плян абавязковага сельскага страхаваньня на 1928-29 г.

У прыватнасьці ўводзіцца, як спроба, на тэрыторыі Менскай і Бабруйскай акруг страхаваньне пасеваў ад вымаразак, вымачак і выправаньняў. Тарыфныя стаўкі па страхаваньні пасеву ад вымачак, вымаразак і выправаньняў устанаўляюцца ў разьмеры 2 проц. Тарыфныя стаўкі па страхаваньні пасеваў ад градабіцьця ўстанаўляюцца ў разьмеры 1,4 проц., па страхаваньні буйнай жывёлы 3,5 проц. і па страхаваньні коняй, як у мінулым годзе—5,5 проц. Льготы бядняцкім гаспадаркам складуць каля 12 проц.

АБ ПАБУДОВЕ ХЛЕБАЗАВОДАЎ.

Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным пабудаваць у Гомелі, Магілеве і Віцебску буйныя хлебазаводы. Кошт Магілеўскага хлебазаводу ўстанаўляецца ў 120тыс. руб., пабудова яго ўжо распачата. Паколькі ў Гомелі пабудова хлебазаводу ідзе са скарыстаньнем будынку пякарні і ўжо ёсьць распрацаваны праэкт заводу вязьдецца падрых тоўка матар'ялаў і заказу на абсталяваньне, Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным закончыць пабудову гэтага заводу ў гэтым годзе і адпусьціць на яго 210 тысяч руб. І нарэшце Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным у гэтым годзе прыступіць да пабудовы хлебазаводу ў г. Віцебску з тым, каб скончыць яго ў 1928-29 г. Кошт Віцебскага хлебазаводу абвыдзецца ў 210 тыс. руб.

НК Гандлю запрапанавана пры складаньні 5-гадовага пляну прадугледзець у ім пабудову і фінансаваньне хлебазаводаў у БССР.

АБ ЗЬНІЖЭНЬНІ ЦЭН НА БУДАЎНІЧЫЯ МАТАР'ЯЛЫ.

Эканамічная Нарада адзначыла, што па шэрагу будаўнічых матар'ялаў зроблена наступнае зьніжэньне цэн: цэны на пяглу ў сярэднім зьніжаны на 11 проц. і ў сучасны момант яны ніжэй, як у суседніх з БССР райёнах; цэны на вапну зьніжаны на 7,5 проц. і г. д. Разам з гэтым Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным зьнізіць цэны на лесаматар'ялы ў сярэднім на 9 проц. супроць сярэдня-гадавых цэн 1926-27 г.

1-шы ўсебеларускі зьезд ТДА-Авіяхіму.

Выступленьне т. т. Кнорына і Ягорава на зьезьдзе.— «СТОПРОЦАНТНАЕ ЎЦЯГНЕНЬНЕ Ў ШЭРАГІ ТДА-АВІЯХІМУ ЎСЯЕ РАБОЧАЕ МОЛАДЗІ—НАША БАЯВАЯ ЗАДАЧА».

15-га мая на зьезьдзе ТДА-Авіяхіму выступіў з прамовай аб чарговых задачах ТДА-Авіяхіму Камандуючы Вайскамі Беларускай Вайсковай Акругі т. Ягораў.

Першы зьезд ТДА-Авіяхіму Беларусі,—зазначыў т. Ягораў—мае, бязумоўна, вялікае значэньне. Гэта можна тлумачыць тым, што яго склік супадае з практычнай пастаноўкай намі ў недалёкім мінулым у Жэнева ва ўсю шырыню перад буржуазіяй і пралетарыятам усяго сьвету пытаньня аб разброеньні. З другога боку самая работа ТДА-Авіяхіму ў сучасны пэрыяд падыйшла да такога рубяжу, калі ўнутраныя рамкі работы аказваюцца ўжо цесныя і, бязумоўна, мы стаім перад задачай пашырыць гэтыя рамкі, павялічыць аб'ём работы ТДА-Авіяхіму і, такім чынам, уключыць у яе праграмы новыя канкрэтныя задачы.

Найбольш важнымі задачамі зьяўляюцца:

— Неабходнасьць стопроцантнага ахопу і ўцягненьня ў шэрагі ТДА-Авіяхіму ўсяе рабочае моладзі і ў першую чаргу камсамолу.

Разгортваньне арганізацыйнага ахопу вёскі, дзе работа зусім малая і нізкая па якасьці.

Пагалоўнае ўцягненьне начскладу ў працу па падрыхтоўцы працоўных да абароны.

Ажыўленьне і пастаноўка на больш цьвёрдыя рэйкі навукова-дасьледчай работы.

У такой пасьлядоўнасьці і з такім канкрэтным падыходам да задач, мне здаецца, што мы павінны прылажыць усю энэргію і ўвагу, тым больш, што Савецкая Беларусь зьяўляецца часткай такога тэрытарыяльнага зьвяна, якое на выпадак вайсковае сутычкі будзе першым плацдармам для вайны.

АБ МАСАВАЙ ПРАЦЫ ТДА-АВІЯХІМУ

зрабіў даклад генэральны сэкратар т-ва т. Чэшка.

— Адной з асноўных умоў разьвіцьця т-ва,—адзначыў дакладчык, — зьяўляецца шырока разгорнутая і наладжаная масавая праца т-ва.

Нашай чарговай задачай зьяўляецца замацаваньне і перавыхаваньне тых сяброў т-ва, якія былі завярбаваны ў час кампаніі стыдзень абароны», шырокае тлумачэньне працоўным аб небясьпецы вайны, навучаньне элемэнтарным вайсковым ведам, перападрыхтоўка і падрыхтоўка каманднага і палітычнага складу, прапаганда ўжываньня мінэральнага ўгнаеньня ў сельскай гаспадарцы, ужываньне хэміі ў барацьбе са шкоднікамі сельскай гаспадаркі і г. д.

Дзеля ўцягненьня працоўных у справу абароны краіны павінна быць праведзена адпаведная праца сярод сялянства і паасобна сярод работніц і сялянак, трэба больш актыўна ўцягваць у гэту справу нацыянальныя меншасьці. Каб даць магчымасьць прымаць удзел у працы ТДА-Авіяхіму батрацтву і беднаце, трэба будзе зьнізіць для гэтых катэгорый уступныя ўзносы. Поруч з гэтым трэба дабіцца ў гэтай працы ўдзелу вясковага актыву з дапрызыўнікаў, перамоннага складу.

ЗНАЧЭНЬНЕ ХЭМІІ Ў С. ГАСПАДАРЦЫ.

16-га мая праф. Кедраў зрабіў даклад аб значэньні хэміі ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы. У СССР, у прыватнасьці ў Савецкай Беларусі, ёсьць шмат карысных мінэралаў і выкапняў. Фасфарыты БССР можна ўжываць у сельскай гаспадарцы. З торфу, якога мы маем вялізарныя запасы, можна здабыць пры сухой перагонцы вельмі каштоўныя хэмічныя прадукты. Вялікае значэньне ў сельскай гаспадарцы адыгрывае попел, які можа канкураваць з самай лепшай калійнай сольлю. Солямі ў адносінах хэмічнай прамысловасьці і хэмізацыі сельскай гаспадаркі Савецкі Саюз вельмі адстаў, тым часам, як у нас ёсьць усё для гэтага. Апрача таго, хэмія можа адыграць вялікую ролю ў справе абароны краіны.

Вось чаму неабходна зьвярнуць вялікую ўвагу на ўкараненьне ведаў хэміі ў шырокія пласты працоўных.

Аб рабоце Беларускага аддзяленьня Ўсесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі.

На апошнім пасяджэньні СНК быў выслуханы даклад праф. Пісарава аб дзейнасьці Беларускага Аддзяленьня Ўсесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі і новых культур.

Беларускае Аддзяленьне Інстытуту Прыкладной Батанікі было арганізавана ў 25 г. пастановаю СНК БССР за 10-X—25 г. Была ўтворана Беларуская станцыя гэтага Інстытуту, якая пачала працаваць з 1926 г. у гаспадарцы Лошыца і хутары Зацішша з усімі тэхнічнымі і дапаможнымі прадпрыёмствамі, якія знаходзяцца на адлегласьці 5-6 вёрст ад г. Менску. Асноўная задача станцыі—выяўленьне годнасьці для БССР розных культур, якія зьбіраюцца Інстытутам у сусьветным маштабе, а таксама правядзеньне ва ўмовах БССР часткі работ, якія праводзяцца Ўсесаюзным Інстытутам Прыкладной Батанікі. Станцыя вывучае гатунак розных культур і выяўляе гаспадарчую каштоўнасьць гатунку, а таксама прыгоднасьць яго для прыродна-гістарычных умоў Беларусі.

Як вядома, аднэй з галоўнейшых прычын нізкай ураджайнасьці палёў БССР зьяўляецца нізкая якасьць насеньня і пасадачнага матар'ялу свае вытворчасьці, а таксама і тое, што насенны матар'ял, які ўвозіцца ў БССР з іншых мясцовасьцяй, не адпавядае мясцовым умовам. У гэтых адносінах адчуваецца перш за ўсё недахват такіх гатункаў, у даходнасьці якіх была-б упэўненасьць. З гэтай прычыны ўвядзеньне новых гаспадарча больш каштоўных гатункаў і форм набывае для БССР выключна важнае значэньне. У рабоце па палепшаньні с.-г. культур могуць служыць і мясцовыя матар'ялы ў выніку доўгага адбору, але ў першую чаргу трэба шырока скарыстоўваць гатункі і паасобныя расьліннасьці, якія зьбіраюцца з розных канцоў зямлі.

Станцыяй зьвяртаецца асаблівая ўвага на культуры, якія маюць для БССР ня толькі гаспадарчае, але і аграмаднае эканамічнае значэньне. У сучасны момант работа станцыі наладжана па вывучэньні наступных культур: кармавых і лугавых расьлін, гародных, пладова-ягадных, сорнай расьліннасьці, спрабаваньня гатункаў гародных і палявых культур, натуралізацыі расьлін, лекавых, тэхнічных і новых культур і палявых расьлін.

Сярод палявых культур максымум увагі зьвяртаецца на бульбу, як на тэхнічны прадукт. Улетку 1927 г. станцыя мела калекцыю каля 260 гатункаў бульбы пераважна нямецкай, галяндзкай, амэрыканскай і ангельскай селекцыі. Вывучэньне гатункаў бульбы праводзіцца з мэтаю даць для мясцовых вопытных сельска-гаспадарчых станцый пэўны насенны матар'ял, пры гэтым зьвяртаецца ўвага на падбор такіх гатункаў, якія карысны для крахмальна-патачнай і вінакуранай прамысловасьці. Сярод ячменяў ёсьць вельмі каштоўная група абразцоў (каля 200) абісінскіх ячменяў, дабытых апошняй экспэдыцыяй праф. Вавілава. Шмат увагі зьвяртаецца на азімую пшаніцу ў сэнсе яе ўраджайнасьці, магчымасьці вытрываць замярзаньне і г. д. Ставіцца пытаньне аб замене ва ўмовах БССР культуры жыта больш каштоўнай культурай—азімаю пшаніцай.

У выніку дасьледваньня гатункаў на палёх гаспадаркі размножваецца шэраг зернавых культур, ураджаі якіх, як насенны матар'ял, перадаюцца мясцовым вопытным сельска-гаспадарчым станцыям. Вялікая работа разгортваецца па лугавых і кармавых расьлінах. Колькасьць абразцоў перавышае 1500 і сярод іх вялікае месца займаюць яравая і азімая віка, а таксама кармавыя кораньплоды, цімафеёўка, сэрадэля і інш. Праводзіцца работа па шэрагу тэхнічных, лекавых і інтэнсыўных культур.

Утвораны пладовыя гадавальнікі розных назначэньняў (калекцыйны, сэлекцыйны, вопытны і інш.) з агульным лікам насаджэньняў больш 65 т. шт., якія зьяўляюцца вельмі каштоўным матар'ялам у адносінах гатункаў; яблынь налічваецца больш 350 абразцоў, груш больш 75 і г. д. Станцыя ўжо адпускае са сваіх гадавальнікаў гатункові матар'ял мясцоваму насяленьню. Так, за адну восень 1927 г. было адпушчана высока-каштоўнага гатовага пасадачнага матар'ялу розных парод пладова-ягадных расьлін больш 1500 саджанцаў, а таксама перададзена Горацкай Вопытнай Садовай Станцыі значная колькасьць гатунковага матар'ялу паземак і трускавак. Апрача гэтага са свайго пасадачнага матар'ялу станцыя пачала закладаць у сябе сады.

Па агародных расьлінах колькасьць абразцоў перавышае 1000 штук, з іх большая ўвага зьвяртаецца на капусту, гуркі, таматы, на бабовыя—як на культуры, якія могуць у далейшым значна павялічыць таварнасьць сельскай гаспадаркі БССР. Сярод гэтых культур станцыяй вылучан шэраг цікавых гатункаў, насенье якіх штогод адпушчаецца мясцоваму насяленьню.

Разам з вышэйзазначанымі работамі станцыя праводзіць таксама работы экспэдыцыйна-дасьледчага характару. Так, пад непасрэдным кіраўніцтвам праф. Гайдукова праводзіцца дасьледваньне сорнай флёры БССР. Да гэтага часу ўжо абсьледваны Менскі, Гомельскі, Слуцкі райёны, у бягучым годзе мяркуецца абсьледваць Магілеўскі, Полацкі, Аршанскі і Мазырскі райёны. Праводзіцца дасьледваньне дзікіх лекавых і тэхнічных расьлін па БССР. У 1927 г. пачаты работы пад кіраўніцтвам праф. Пашкевіча па дасьледваньні пладаводзтва БССР. Пад непасрэдным кіраўніцтвам праф. Пісарава праводзіцца дасьледваньне палявых расьлін. З 1928 г. намячаецца пад кіраўніцтвам праф. Жукоўскага абсьледваньне культу

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

АБ УПАРАДКАВАНЬНІ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА РАБОЧАГА ЖЫЛЬЛЁВА А БУДАЎНІЦТВА.

На падставе арт. 8 пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 4 студзеня 1928 г. «Аб жыльлёвай палітыцы» (З. З. Саюзу ССР 1928 г. № 6, арт. 49), Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Штогодны плян фінансаваньня жыльлёвага будаўніцтва, якое робіцца рабочымі і служачымі індывідуальным парадкам для сваіх патрэб, прадугледжвецца агульным плянам крэдытаваньня рабочага жыльлёвага будаўніцтва па ўсіх фондах, паказаных у арт. 22 пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР 15-га чэрвеня 1927 г. аб мерах дапамогі будаўніцтву рабочых жыльлёў (Зб. Зак. СССР 1927 г. № 36, арт. 369).

2. Будаўніцтва індывідуальным парадкам не дазваляецца на тэрыторыі прамысловых прадпрыёмстваў, а таксама на землях, якія перададзены транспарту.

3. Снабжэньне індывідуальнага рабочага жыльлёвага будаўніцтва неабходнымі будаўнічымі матар'ялами можа рабіцца Беларускім Саюзам і мясцовымі саюзамі жыльлёвай каапэрацыі.

4. Доўгатэрміновыя пазыкі індывідуальным забудоўшчыкам з рабочых і служачых, якія будуюць жыльлё для сваіх патрэб, выдаюцца Камунальным Банкам з сваіх асноўных капіталаў на тэрмін ня звыш 10 год.

5. Выдача пазык робіцца Камунальным Банкам на падставе дагавораў з кожным забудоўшчыкам паасобку на наступных грунтоўных умовах:

а) забудоўшчыкі абавязаны ўкласьці ў будаўніцтва ня менш 30 проц. кошту будуемых будынкаў; б) парадак і тэрміны пагашэньня пазычак устанаўляюцца банкам асобна для кожнага забудоўшчыка; в) крэдытаваньне робіцца толькі пры захаваньні індывідуальнымі забудоўшчыкамі мінімальных тэхнічных і санітарных норм, якія ўстаноўлены падлягаючымі органамі; г) забудоўшчыкі абавязаны да поўнага пагашэньня ўсяе пазычкі ўтрымаць будынкі ў поўнай спраўнасьці, рабіць своячасны бягучы і капітальны рамонт і прымаць усе меры для захаваньня будынкаў; д) забудоўшчык абавязан страхаваць на свой кошт будынкі з часу пачатку будаўнічых работ, а згараемыя будаўнічыя матар'ялы—з часу іх набыцьця ў разьмеры поўнай страхавой ацэнкі; е) на скончэньню ўсіх будоўных работ будынкі павінны застрахавацца забудоўшчыкам на свой кошт у разьмеры поўнай страхавой ацэнкі; е) пазычкі якія выдаюцца забудоўшчыкам, забясьпечваюцца залогам права забудоўкі.

6. У хадайніцтве аб выдачы пазычкі павінна дакладна паказваць: а) назначэньне, падставы неабходнасьці і разьмер пазычкі; б) разьмер сваіх сродкаў, якія ўкладаюцца забудоўшчыкам у будаўніцтва жыльлё; в) тэрмін скончэньня будаўніцтва і агульны разьмер кошту ўсяго будаўніцтва; г) пажаданы для забудоўшчыка тэрмін выдачы пазыкі і разьмер заработнай платы, які атрымліваецца забудоўшчыкам і членамі яго сям'і, у мэтах выяўленьня магчымасьці пагашэньня ў тэрмін пазычкі з налічанымі на яго процантамі.

7. Да хадайніцтва аб выдачы пазычкі павінна прыкладаць наступныя дакументы: а) дагавор аб праве забудоўкі, плян будынкаў з паказаньнем кубатуры і жылой плошчы праэктуемага дому; б) рахункова кніжка з месца службы.

8. Па пазычках, якія выдаюцца Камунальным Банкам рабочым і служачым для пабудовы жыльлёў, узімаецца на звыш 3 проц. гадавых.

9. На падставе прадстаўляемых матар'ялаў, Праўленьне Камунальнага Банку ўстанаўляе разьмер пазычкі і спаганяемых па ёй процантаў, вызначае тэрмін пазычкі і ўмоў яе выдачы і пагашэньня, аб чым паведамляе забудоўшчыка.

10. Для афармленьня пазычкі, забудоўшчык падпісвае дагавор з Камунальным Банкам па ўсганоўленай апошнім форме і з захаваньнем умоў, паказаных у арт. 5 гэтай пастановы.

11. Дазволеная пазычка выдаецца Камунальным Банкам поўнасьцю або часткамі ў тэрміны і ў разьмерах, якія ўстаноўлены дагаворам аб пазычцы.

12. Для кантролю за правільнасьцю скарыстаньня пазычкі забудоўшчыкамі Камунальны Банк мае права: а) патрабаваць ад забудоўшчыка прадстаўленьня зьвестак аб выдатках па будаўніцтву, якія ўтвораны на сродкі, адпушчаныя да будаўніцтва па пазычцы Камунальнага Банка, а пры неабходнасьці, патрабаваць таксама прадстаўленьня апраўдальных дакумэнтаў і б) утвараць, як у час пабудовы, таксама па скончэньні яе агляд і абсьледваньне будаўніцтва.

13. Пры скарыстаньні забудоўшчыкам позычкі поўнасьцю або часткова не папростаму прызначэньню Банк мае права патрабаваць датэрміновага пагашэньня пазычкі з выплатай процантаў па ёй з часу выдачы ў разьмеры нармальнага банкаўскага процанту.

14. Камунальны банк мае права патрабаваць датэрміновага пагашэньня пазычкі з выплатай толькі абмоўленага дагаворам процанту таксама ў наступных выпадках:

а) калі забудоўшчык прапусьціць чарговы плацеж Камунальнаму Банку больш чым на два месяцы;

б) калі забудоўшчык чым-небудзь іншым парушыць заключаны дагавор.

15. У выпадках, якія не прадугледжаны гэтай пастановай, узаемаадносіны паміж забудоўшчыкам і Камунальным Банкам рэгулююцца статутам апошняга.

16. Па пазычках, якія выдадзены індывідуальным забудоўшчыкам з рабочых і служачых да выданьня гэтай пастановы, дапушчаецца па хадайнічаньням пазычкіхаў зьмена прадугледжаных у заключаных з імі дагаворах умоў у сэнсе прывязденьня іх у адпаведнасьці з патрабаваньнямі арт. 4 і 5 гэтай пастановы з тым, аднак, каб прадугледжаныя памянёнымі артыкуламі ўмовы крэдытаваньня ўжываліся толькі да тэй частны капітальнага доўгу па пазычках, па якіх тэрмін пагашэньня яшчэ не наступіў у час выданьня гэтай пастановы.

17. Адвод зямельных вучасткаў пад індывідуальнае жыльлёвае будаўніцтва рабочых і служачых робіцца органамі камунальнай гаспадаркі па належнасьці не пазьней як у месячны тэрмін са дню падачы заявы. Арэндная плата за гэтыя вучасткі ня бярэцца.

18. Пры адводзе зямельных вучасткаў павінны захоўвацца ўстаноўленыя правілы аб разьмеры будоўных вучасткаў, санітарный прыгоднас ці і іх адпаведнасьць з маючымся праэктам або меркаваньнямі пашырэньня і пляніроўкі гораду або паселішча.

19. Даручыць Беларускаму Саюзу жыльлёвай каапэрацыі ў месячны тэрмін распрацаваць і ўнесьці на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў праэкт пастановы аб мерапрыемствах па снабжэньню матар'яламі жыльлёвага будаўніцтва, якое робіцца рабочымі і служачымі індывідуальным парадкам, прымаючы пад увагу, што вод пуск матар'ялаў можа рабіцца толькі пасьля таго, як будзе поўнасьцю пакрыта патрэба ў будоўных матар'ялах жыльлёва-каапэрацыйных арганізацый, якія аб'яднаны Белжылсаюзам.

20. Прапанаваць Дзяржаўнай Плянавай Камісіі БССР устанавіць у месячны тэрмін мінімальныя тэхнічныя і санітарныя нормы для індывідуальнага рабочага жыльлёвага будаўніцтва.

В. аб. Старшыні Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР В. Крывіцкі.

17 красавіка, 1928 г.
гор. Менск.

Постановление Экономического Совещания при СНК БССР

ОБ УПОРЯДОЧЕНИИ ИНДИВИДУАЛЬНОГО РАБОЧЕГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.

На основании ст. 8 постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 4-го января 1928 года о жилищной политике (С. З. Союза ССР 1928 года № 6 ст. 49), Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Ежегодный план финансирования жилищного строительства, производимого рабочими и служащими индивидуально для своих нужд, предусматривается общим планом кредитования рабочего жилищного строительства по всем фондам, показанным в ст. 22 постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 15 июня 1927 г. о мерах содействия строительству рабочих жилищ (С. З. СССР 1927 г. № 36 ст. 369).

2. Индивидуальное строительство не разрешается на территории промышленных предприятий, а также на землях, переданных транспорту.

3. Снабжение индивидуального рабочего жилищного строительства необходимыми строительными материалами может производиться Белорусским Союзом и местными союзами Жилищной Кооперации.

4. Долгосрочные ссуды индивидуальным застройщикам—рабочим и служащим на постройку жилищ для своих нужд, выдаются Коммунальным Банком из его основных капиталов на срок не свыше 10 лет.

5. Выдача ссуд Коммунальным банком производится на основании договоров, заключаемых отдельно с каждым застройщиком на следующих основных условиях:

а) застройщики обязаны вложить в строительство не менее 30 проц. стоимости возводимых строений; б) порядок и срок погашения ссуд устанавливается банком отдельно для каждаго застройщика; в) кредитование допускается только при соблюдении индивидуальными застройщиками минимальных технических и санитарных норм, установленных подлежащими органами; г) застройщики обязаны до полного погашения всей ссуды содержать строения в полной исправности, производить своевременно текущий и капитальный ремонт и принимать все меры для сохранения строений; д) застройщик обязан страховать на свой счет строения с начала строительных работ, а сгораемые строительные материалы—со времени их приобретения в размере полной страховой оценки; по окончании всех строительных работ, строения должны страховаться застройщиками на свой счет, в размере полной страховой оценки; е) ссуды, выдаваемые застройщикам, обеспечиваются залогом права застройки.

6. В ходатайстве о выдаче ссуды должно быть точно указано: а) назначение, основание необходимости и размер ссуды; б) размер своих средств, вкладываемых застройщиком в постройку жилища; в) срок окончания строительства и общий размер стоимости всего строительства; г) желательный для застройщика срок выдачи ссуды и размер заработной платы, получаемой застройщиком и членами яго семьи—в целях выявления возможности погашения в срок ссуды с начисленными на ее проц.

7. К ходатайству о выдаче ссуды должны быть приложены следующие документы: а) договор о праве застройки, план строений с указанием кубатуры и жилой площади проектируемого дома; б) расчетная книжка места службы.

8. По ссудам, выдаваемым Коммунальным Банком рабочим и служащим для постройки жилищ, взимается не свыше 3-х процентов годовых.

9. На основании представленных материалов Правление Коммунального Банка устанавливает размер ссуды, взыскиваемого по ней процента, срок и условия выдачи и погашения ссуды, о чем и уведомляет застройщика.

10. Для оформления ссуды застройщик заключает договор с Коммунальным Банком по установленной последним форме и с соблюдением условий, указанных в ст. 5 настоящего постановления.

11. Разрешенная ссуда выдается Коммунальным Банком полностью или частично в сроки и в размерах установленных договором ссуды.

12. Для контроля за правильностью использования ссуды застройщиком Коммунальный Банк вправе: а) требовать от застройщика представления сведений о расходах по строительству, произведенному на отпущенные средства на постройку по ссуде выданной Коммунальным Банком, а в случае необходимости требовать также и представления оправдательных документов и б) производить как в период постройки, а также по окончании ее, осмотр и обследование строительства.

13. При использовании застройщиком ссуды полностью или частично не по прямому назначению Банк вправе требовать досрочного погашения ссуды, с выплатой процентов по ней со времени выдачи в размере нормального банковского процента.

14. Коммунальный Банк вправе требовать досрочного погашения ссуды с выплатой только обусловленного договором процента также в следующих случаях:

а) когда застройщик просрочил выплату очередного платежа Коммунальному Банку больше, чем на два месяца;

б) в случае иных нарушений договора.

15. В случаях, не предусмотренных настоящим постановлением, взаимоотношения между застройщикам и Коммунальным Банком регулируются уставом последнего.

16. По ссудам, выданным индивидуальным застройщикам—рабочим и служащим—до издания настоящего постановления, допускается по ходатайствам последних изменение условий заключенных с ними договоров в отношении приведения их в соответствие с требованиями ст. 4 и 5 настоящего постановления с тем однако, чтобы предусмотренные упомянутыми статьями условия кредитования применялись только к той части капитального долга по ссудам, по которым срок погашения еще не наступил в момент издания настоящего постановления.

17. Отвод земельных участков для индивидуального жилищного строительства рабочих и служащих производится подлежащими органами коммунального хозяйства не позже месячнага срока со дня подачи заявления.

Арендная плата за эти участки не взимается.

18. Отвод земельных участков производится с соблюдением правил о размерах строевых участков, санитарной пригодности и в соответствии с существующим проектом или предположениями расширения и планировки данного города или местечка.

19. Поручить Белорусскому Союзу жилищной кооперации в месячный срок разработать и внести на утверждение Совета Народных Комиссаров проект постановления о мероприятиях по снабжению материалами жилищного строительства, производимого рабочими и служащими в индивидуальном порядке, учитывая, что отпуск материалов может производиться только после того, как будут полностью удовлетворены нужды жилищно-кооперативных организаций, об'единенных Белжилсоюзом.

20. Предложить Государственной Плановой Комиссии БССР установить в месячный срок минимальные технические и санитарные нормы для индивидуального рабочего жилищного строительства.

И. об. Председателя Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР К. Бенек.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР В. Кривицкий.

17 апреля 1928 г.
г. Минск.

Дасягненьні і недахопы ў сыстэме с.-г. крэдыту.

(З НАРАДЫ АКЦЫЯНЭРАЎ БЕЛСЕЛЬБАНКУ).

Першае пытаньне, якое абгаварыла нарада, была справаздача праўленьня Белсельбанку за 1926-27 г.

Да дасягненьняў у працы банку можна аднесьці скончэньне працы па арганізацыі акруговых т-ваў сельска-гаспадарчага крэдыту: **пашырэньне нізавой сеткі з 166 да 203 таварыстваў, дзякуючы чаму крэдыт набліжан да сялянства**; праведзена рэвізійнае абсьледваньне ўсіх Акрсельбанкаў; значнае пашырэньне агульна-банкаўскіх апэрацый у нізавой сетцы с.-гасп. крэдытнай каапэрацыі.

Разам з тым ёсьць і шэраг недахопаў, на зьліквідаваньне якіх прыдзецца зьвярнуць увагу новаму праўленьню. Недастаткова абслугоўваецца нізавая сетка; няправільна скарыстоўваецца бяжняцкі фонд; слаба яшчэ прыцягнуты таварыствамі сродкі самога насельніцтва; культае крэдытная дысцыпліна з боку пазычальнікаў; недастаткова скарыстоўваліся сродкі, якія былі вызначаны на індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі і інш.

Ухвалена шэраг пастаноў, якія прадугледжваюць палепшаньне і пашырэньне справы крэдытаваньня сельскай гаспадаркі. Паміж іншым, даручана праўленьню Банку і Савету апошняга прыняць рашучыя крокі да павялічэньня ўкладаў і паявых узносаў у сельска-гаспадарчых крэдытных таварыствах.

Прыбытак банку за 1926-27 г., у суме 344.385 руб. сход акцыянэраў разьмеркаваў так: у фонд каапэраваньня беднаты—70.000 руб., у фонд крэдытаваньня беднаты—34438 руб., у фонд крэдытаваньня індустрыялізацыі калхозаў—23291 руб., на арганізацыю курсаў—10.000 руб., а рэшта—у запасны капітал і на дывідэнт па акцыях.

Нарада пастанавіла павялічыць асноўны капітал Белсельбанку да 5.000.000 руб. Прызнана таксама наабходным утварыць пры Белсельбанку асобны гарантыйны фонд па ўкладах у таварыствах.

У заключэньне сход зрабіў перавыбары кіруючых органаў Банку і ў праўленьне абраны т. т. Дубіна, Матусэвіч і Трахімаў; Савет Банку абраны ў складзе 15 асоб. Старшынёй Савету зьяўляецца т. Васілевіч, намесьнікам—т. Прышчэпаў.

Галоўлітбел 302.

ХРОНІКА.

У тыдзень кас ашчаднасьці---лік укладчыкаў павінен падвоіцца.

З 15 мая распачаўся юбілейны тыдзень набліжэньня кас ашчаднасьці да насельніцтва. Гэты тыдзень працягнецца да 22 мая, г. зн. да таго дню, калі пяць год таму назад на тэрыторыі БССР адчынілася першая дзяржаўная працоўная каса ашчаднасьці.

У гэты тыдзень усе працоўныя масы Беларусі павінны шырока азнаёміцца з дасягненьнямі савецкіх кас ашчаднасьці. Зараз касы ашчаднасьці ў БССР абслугоўваюць да 85.000 укладчыкаў, якія да пяцёхгодзьдзя свайго існаваньня ўжо маюць 5.000.000 р. укладаў. Праўда, гэтыя лічбы яшчэ недастатковыя, і нам трэба ўвесь час весьці працу з такім разрахункам, каб уцягваць у касы ашчаднасьці ўсё новыя і новыя тысячы працоўных гораду і вёскі.

Практыка працы кас ашчаднасьці даводзіць, што чым больш асьвятляецца іх дзейнасьць, чым большыя колы працоўных ведаюць аб карысьці ад кас ашчаднасьці, тым лепш і хутчэй разьвіваецца справа ашчаднасьці. З гэтай прычыны і абвешчан тыдзень набліжэньня кас ашчаднасьці да насельніцтва.

У гэты тыдзень касы ашчаднасьці БССР, дзеля большай папулярызацыі справы ашчаднасьці, 17, 18 і 19 мая, усім асобам, якія ў гэты дні рэгіструюць у Загсе свае шлюбы, будуць выдаваць кніжкі ашчаднасьці з рублёвым узносам кніжкі ашчаднасьці на імя нараджонага.

Для таго, каб даць магчымасьць рабочым і служачым рабіць уклады ня трацячы часу, уведзена сыстэма адлічэньня ад зарплаты вызначанай самім працоўным сумы, якая залічваецца на рахунак апошняга.

Уся савецкая грамадзкасьць, усе арганізацыі на мясцох павінны аказаць максымальнае садзейнічаньне апарату кас ашчаднасьці ў правядзеньні гэтага тыдню.

Пастаўленая перад касамі ашчаднасьці задача будзе выканана толькі пры агульным падтрыманьні.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 17 МАЯ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. —прад. 4—67,5, куп. 4—65,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—07, куп. 5—05.

Абл. 2 сял. паз. куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—05,5, куп. 5—03,5.

Абл. 10-проц. паз. 27 г.—прад. 25—30, куп. 25—20.

Абл. дзярж. паз. 1926 г.—прад. 121, куп. 119.

Абл. 12-проц. паз.—прад. 105—58 куп. 105—53.

Абл. паз. індустр.— прад. 24—73,5, куп. 24—63,5.

Усебеларуская нарада камуністаў-літоўцаў.

15-га мая а 9 гадзіне раніцы ў памяшканьні ЦК КП(б)Б адчынілася Усебеларуская нарада літоўцаў-камуністаў. На нарадзе прымае ўдзел 36 делегатаў, з якіх 12 чал. з округ і адзін прадстаўнік літоўскага сэктара камуністычнага Універсытэту нацыянальнасьцяў Захаду.

Нараду адчыніў загадчык АПА ЦК КП(б)Б тав Абрамчук, які ў сваёй уступнай прамове адзначыў, што гэта нарада павінна будзе больш завастрыць увагу партыі ў працы сярод літоўскага насельніцтва, падвесьці маючыя вынікі і вызначыць далейшыя мерапрыемствы.

Пасьля ўступнай прамовы т. Абрамчука, нарада заслухала даклад тав. Бачукаса аб працы і дзейнасьці літбюро ЦК КП(б)Б. З дакладу відаць, што за апошнія 2 гады маюцца значныя дасягненьні ў працы сярод літоўскага насельніцтва: адчынена 10 літоўскіх школ, 3 хаты-чытальні, 15 чырвоных куткоў і інш. Таксама значна ўзмацнілася партпрацa сярод літоўцаў. У спрачках па гэтым дакладу адзначалася, што нізавыя парт арганізацыі мала зварачваюць увагі на працу сярод літоўскага насельніцтва, слаба ўцягнуты ў працу літоўцы-камуністы. Разам з гэтым адзначалася палепшаньне ўдзелу літоўскага прапоўнага насельніцтва ў савецкім будаўніцтве.

* * *

Учора на вячэрнім пасяджэньні быў заслухан даклад т. Вэдрынайціса аб агітпрапагандысцкай працы.

Сёньня будзе заслухан даклад т. Вілуная аб антырэлігійнай працы і даклад т. Сэрбэнта аб літоўскім выдавецтве ў БССР.

Зачыніцца нарада сёньня.

На дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР, на дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы:

адаслаў па прыналежнасьці 10000 руб., сабраных сярод працоўных

Упарадкаваньне мястэчак.

У выкананьне пастановы ўраду БССР аб правядзеньні ўпарадкаваньня мястэчак праўленьне Белсельбанку запрапанавала акруговым сельска-гаспадарчым крэдытным таварыствам выдзеліць на гэтую патрэбу 166504 р.

На ўпарадкаваньне мястэчак Меншчыны будзе адпушчана 26350 руб., Бабруйшчыны—36769 р., Гомельшчыны—23550 р., Віцебшчыны—22400 руб., Магілеўшчыны—24500 руб., а рэшта—іншым округам.

Сувязь гарсавету з абіральнікамі.

Каб устанавіць больш шчыльную увязь дэпутатаў Менскага гарсавету з сваімі абіральнікамі, у хуткім часе ўводзяцца дзяжурствы дэпутатаў гарсавету на 10-ці буйнейшых прадпрыёмствах г. Менску.

Дэпутаты будуць знаёміць абіральніках з пастановамі савету, прымаць розныя заявы і скаргі, вырашэньне якіх знаходзіцца ў кампэтэнцыі гарсавету.

І-ы БДТ прыяжджае ў Менск.

4 чэрвеня, пасьля 7-месячнага падарожжа па БССР, прыяжджае ў Менск 1-ы Беларускі Дзяржаўны Тэатр.

За гэты час тэатр наведаў Віцебскую, Магілеўскую і Аршанскую округі.

Тэатр усюды карыстаўся вялікім посьпехам.

Да збору лекавых расьлін.

Белкаапсаюз і Белмэдгандаль зьвярнуліся з адозвай да сялянства аб распачацьці збору лекавых расьлін. У гэтай здозьве прыводзяцца парады, як зьбіраць і сушыць расьліны. У першую чаргу раіцца зьбіраць: лясную маліну, валер'янавы і аерны корань, дурнаў'ян і інш.

Экспарт крахмалу за межы.

Нар. Кам. Гандлю БССР даў заданьне Белсельтрэсту экспартаваць у бягучым годзе за межы 40.000 пуд. крахмалу. Да гэтага часу ўжо экспартавана 36.000 пуд., рэшта будзе адпраўлена у маі. Крахмал экспартаваўся ў Нямеччыну, Аўстрыю, Фінляндыю і Латвію.

Такім чынам, экспартнае заданьне па крахмалу будзе сёлета выканана поўнасьцю.

У наступным годзе мяркуецца экспартаваць за межы 80.000 пудоў крахмалу.

Савецкі дзень.

40000 руб. на набыцьцё навуковага абсталяваньня адпусьціў Нар. Кам. Асьветы Беларускаму Дзяржаўнаму Універсытэту. На гэтыя сродкі будзе закуплена замежнае абсталяваньне для катэдраў неарганічнай хэміі і фізыкі.

Мэханічную майстэрню для вырабу паперовых пакетаў арганізавала Беларускае аддзяленьне т-ва былых політкатаржан. Гэта дасьць магчымасьць зьліквідаваць беспрацоўе сярод сяброў т-ва.

34 студэнты Менскага архітэктурна-дарожна-будаўнічага тэхнікуму, якія канчаюць сёлета курс, будуць накіраваны на будаўнічыя работы.

100.000 руб. атрымаў Белсельтрэст на ўзмацненьне зваротных сродкаў савецкіх гаспадарак Беларусі. Апрача таго, Белсельтрэсту адпушчана Белсельбанкам 50.000 руб. на пашырэньне насеннаводзтва.

Курсы для перападрыхтоўкі працаўнікоў сельска-гаспадарчай каапэрацыі арганізоўвае Белсельсаюз: месячныя—для старшынь нізавой сеткі з 10 чэрвеня і для рахункаводаў—з 15 ліпеня да 1 верасьня. Усяго праз курсы мяркуецца прапусьціць да 160 чалавек.

9 вагонаў экспортных яек адпраўлена з БССР за апошні час у Бэрлін. У гэтым ліку 5 вагонаў адпраўлена са Слуцку, 2—з Віцебску і 2--з Гомеля.

Згодна пастановы Пленуму ЦКК УсеКП(б), для прыёму наведвальнікаў са ўсякага роду скаргамі, прапановамі і заявамі ад усіх грамадзян на непарадзі ў савецкіх установах і прадпрыёмствах устанаўлецца у ЦКК-НКРСІ (Савецкая, 55. 2-гі паверх, 7-мы пакой) дзяжурства членаў і кандыдатаў ЦКК і членаў Калегіі НК РСІ ва ўсе дні адпачынку з 10 да 15 гадз. і ў рабочыя дні ад 18—21 гадз., а ў Бюро Скаргаў НКРСІ—штодзённа ў рабочыя дні ад 11 да 15 з пал. гадз. Акрамя таго, прыём наведвальнікаў: у Старшыні ЦКК КП(б)Б і Наркома РСІ—т. Калініна па панядзелках ад 9—12 гадз.; у Нам. Наркома т. Віленстовіча у сераду—ад 11 да 15 і у Нам. Наркома т. Эльвінда—па пятніцам—ад 11 да 15 гадз.

У Менскай АКК-РСІ (вуліца Энгельса, 28) дзяжурства членаў МКК—ва ўсе дні адпачынку з 10 да 15 гадз., а ў Бюро Скаргаў Акруговай Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі штодзённа ў рабочыя дні ад 10 да 15 з пал. гадз.

КРЭДЫТЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Праўленьне Белсельбанку адпусьціла 71560 руб. спэцыяльна на пашырэньне насеннаводзтва. З агульнай сумы адпушчана Аршаншчыне 18090 руб. Віцебшчыне для мясцовай дасьледчай сельска-гаспадарчай станцыі 3470 р., а рэшта сродкаў адпушчана саўхозам БССР.

АРГАНІЗАЦЫЯ МЭХАНІЧНАЙ ТЭЛЕФОННАЙ СТАНЦЫІ.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому прызнаў неабходным пераабсталяваць Менскую тэлефонную станцыю ў мэханічную на 3000 абанэнтаў. Пераабсталяваньне станцыі дасьць магчымасьць належна забясьпечыць горад пажарнай сыгналізацыяй.

АДЧЫНЕНЬНЕ ДОМУ АДПАЧЫНКУ Ў ЖДАНОВІЧАХ.

15-га мая ў Ждановічах адбылося адчыненьне летняга дому адпачынку.

Дом грунтоўна адрамантаван і будзе прапускаць кожныя 2 тыдні 320 чал., з іх 150 чал. бясплатна. Пры доме адпачынку будзе арганізаван спэцыяльны пакой для дзяцей.

МАЛАТОК БРОНЗАВАГА ВЕКУ.

Настаўніца Пірэеўскай школы, Буда-Кашалёўскага райёну, Гомельскай акругі І. Рыта перадала ў археалёгічную камісію ІБК каменны малаток, які быў знойдзен селянінам в. Забаб'е Міхаленкам. Малаток гэты адносіцца да пэрыяду бронзавага веку, літоўскага пахаджэньня і мае значную археалёгічную каштоўнасьць.

Цікава адзначыць тое, што селянін ужываў гэты малаток у гаспадарцы, як начыньне, і толькі нядаўна выменяў яго на жалезны.

Матч Горкі—Менск.

У панядзелак, 13 мая, на пляцоўцы «Прафінтэрн» адбыўся баскетбольны матч паміж камандай працаўнікоў Наркамзему і прыехаўшай з Горак камандай студэнтаў с.-г. акадэміі. Матч скончыўся пасярэдзіне другога хаўтайму з вынікам 13:13.

За непадчыненьне правілам каманда Менску была зьвята з поля. Трэба акр. савету фізкультуры зьвінчыць падобныя факты недысцыплінаванасьці.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі:

1. «У краіне райскае птушкі» Я. Маўр. Стар. 150, цана 1 р. 75 к.
2. «Вэтэрынарыя і Зоогігіена» І. М. Серада. Падручнік для сельска-гаспадарчых школ, агрономаў, жывёлаводаў і сельскіх гаспадароў. Стар. 334, цана 3 руб. Выд. Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Менск.
3. «На литературном посту» № 9 за 1928 год. Стар. 79, цана 50 кап. Выд. Дзяржаўнага Выдавецтва, Масква.
4. «Красная печать» № 8 за 1928 г. Стар. 64, цана 50 кап. Двухтыдневы орган Аддзелу Друку ЦК УсеКП(б). Дзяржаўнага Выдавецтва, Масква—Ленінград.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У пятніцу, 18 мая, Праўленьне Дому Асьветы запрашае яч. ЛКСМ падшэфн. часьці, юнэскцыю а 5 гадз. увечары ў сад для скончэньня працы па прывязденьні тэніснай пляцоўкі ў належны від.

— 18 мая два кіно-сэансы «Голубая кровь».

Пачатак а 8 і 10 гадз.

— 20 мая канцэрт заслужонага артыста рэспублікі Эрдэнко.

Білеты штодня ў канц. Дому ад 11 да 2 і ад 6 да 9 увеч.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

Адчыненьне 3-га Ўсебеларускага Зьезду ІТр
адбудзецца ў суботу. 19 мая,
роўна а 6 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ
(Дом Працы, 2-гі паверх).
Выдача мандатаў — у пятніцу 18 мая ад 7 да 9 г. увечары ў памяшканьні МБІТ і 19-га там-жа ад 11 гадз. раніцы.

Менская акруговая страхавая канфэрэнцыя адчыняецца 19 мая,
а 7 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу друкароў (Ленінск. 13).
Пасяджэньне францыі а 5 з палов. гадз. увечары.
Мандаты можна атрымаць у памяшканьні страхкасы ў сэкратара штодня ад 10 гадз. раніцы да 4 з палов. гадз. дню і ад 6--7 гадз. увечары.
МЕНАКРСТРАХКАСА.

ЦЫРК-КІНО.

ЦЫРК.	Сёньня і штодня ад 10-й г. раніцы да 11-й г. веч. адкрыта ЗООВЫСТАЎКА ЖЫВЫХ ЗЬВЯРОЎ. Кармленьне зьвяроў а 8-й гадз. вечара.
КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Канцэрт вядомай маскоўскай сьпявачкі Л. Б. БЕЛАГОРСКАЙ ПРЫ ЎДЗЕЛЕ Л.М. МАЛКУСА (РАЯЛЬ), А.Г. ШЫРВІНДА (СКРЫПКА) і мастака жывога слова Н. М. ЭФРОСА. На экране мастацкі фільм „ТРЫВОГА“
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.	З 15 мая—толькі 3 дні сусьветны баявік „ЖЫЦЬЦЁ ЗА ЖЫЦЬЦЁ“ у 2-х сэрыях, 10 частках. З удзел. вядомых артыстаў ПАЎЛЯ ВЭГАНЭРА і ПАЎЛЯ РЫХТЭРА. Толькі 2 сэансы.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З 15 мая 2 замежныя камэдыі за адзін сэанс: I. Сусьветны комік Бэстэр Кейтон у фільму „Наша гасьціннасьць“ у 6 частках. II. Папулярны комік Бэн-Цюрпін—у фільму „Каліф на гадзіну“ у 6 частках.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З 15 мая—новы трука-прыключэнскі кіно-раман—2 сэрыі, 12 частак за адзін сэанс. „ПЛЯМА ЗЛАЧЫНСТВА“

Народны Камісарыят Гандлю БССР
падае да агульнага ведама весткі, што 30 красавіка 1928 году ім унесены, у адпаведнасьці з палажэньнем аб Дзяржаўных Прамысловых Трэстах абвешчаным у С. З. СССР за 1927 г. № 39, арт. 392, у другі падзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) пад № 12 наступныя зьмены статуту
Беларускай Дзяржаўнай Швэйнай фабрыкі „Прафінтэрн“
У Г. ВІЦЕБСКУ:
МЭТА— выраб і збыт гатовага адзеньня, бялізны, спэцвопраткі, шапак і капялюшаў і інш. рэчаў швэйнай прамысловасьці.
НОВЫ СТАТУТ ЗАЦЬВЕРДЖАН ПРАТАКОЛАМ ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ БССР АД 29-га ЛЮТАГА 1928 г. ЗА № 24.
СТАТУТНЫ КАПІТАЛ ВЫЗНАЧАН у 606.000 руб.
Сэкратар НК Гандлю БССР ВЕРАМЕЙЧЫК.

Страхагенцтвам Прамбанку (МЕНСК)
ЗГУБЛЕНА
квітанцыйная кніжка па транспартным (сухапутным) страхаваньні з квіткамі за №№ 896576--896600.
Квіты лічыць несапраўднымі.
ДЗЯРЖСТРАХ.

Аршанскі ЗАГС паведамляе, што 26 мая 1928 г. у памяшканьні ЗАГС будзе разгледжана справа аб скасаваньні шлюбу Белящкага Мікалая Ісаевіча з Завіткоўскай Марыляй. Зацікаўленыя асобы павінны падаць свае пратэсці ў Аршанскі ЗАГС не пазьней 20 мая г. г.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Паявая кніжка № 259 Скалінай Г. П., выд. Чарэйскім спажыв. т-вам, «Пралета, ры», кв. № 565.
— Пашпарт № 815 Флейтман І. Н., выд. Тураўскім РВК у 1927 г., кв. № 566.
— Асабовая карт. № 158 Вараб'я Н. А. выд. Азярыцкім РВК у 1925 г. кв. № 567.
— Пашпарт № 502 Малочка А. Ф., выд. Жыткавіцкім РВК, кв. № 568.
— Вайсковая кніжка № 1690 Грэменка В., выд. Халопеніцкім РВК, кв. № 569.
— Лекавая кніжка № 22452 Залеўскага Ф. К., выд. Крупскай Райстрахкасай, кв. № 570.
— Вучотна-вайсковы білет № 419-249 Каркліна К. П., выд. Менакрваенкаматам, кв. № 571.
— Пасьведчаньне Бязмозгага І. З., выд 4 батар., кв. № 570.
— Пашпарт № 409 Плітка П. Ф., выд. Крупскім РВК, кв. № 570.
— Білет Бязмозгага С. З., выдадзен. Сененскім ваенкаматам, кв. № 570.
— Кніжка дапрыз. Каралькова І. Н., выд. Крупскім РВК, кв. № 570.
— Кніжка дапрыз. № 232 Каптура А. Т., выд. Крупскім РВК, кв. № 570.
— Пасьведчаньне № 322 Моніча П.